© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 38-ы
№ 50 (2410)
27 чэрвеня 1969 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 нап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПРАЦОЎНЫЯ РЭСПУБЛІКІ АДЗІНАДУШНА ВІТАЮЦЬ РАШЭННІ МІЖНАРОДНАЙ НАРАДЫ КАМУНІСТЫЧНЫХ І РАБОЧЫХ ПАРТЫЙ У МАСКВЕ

ДАРОГАЮ ЛЕНІНА

Балгарскі паэт Венка Маркоўскі ў вершы «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!» гэтак выказвае сваю глыбокую любоў і вялікую пашану да нашай роднай Масквы:

Москва! К тебе летит за вестью весть,—
Мы пульс земли в твоей груди открыли.
Москва! Ты наша гордость, сила, честь,
Ты наши руки превращаешь в крылья...

Людзі ўсіх кантынентаў з вялікай надзеяй пазіраюць на светач новай долі — Маскву. Простыя людзі ўсяго свету сваімі сэрцамі былі ў Крамлёўскім палацы, дзе прадстаўнікі 75 камуністычных і рабочых партый абмяркоўвалі самыя важныя праблемы сучаснасці.

Форум камуністаў выпрацаваў Асноўны дакумент — компас, па якім ідзе і будзе ісці далей карабель сацыялізма, дэмакратыі, гераічнай барацьбы працоўных усяго свету за мір, за сацыяльную справядлівасць.

Форум камуністаў прадэманстраваў непахіснасць прынцыпаў пралетарскага інтэрнацыяналізму.

У выступленнях многіх удзельнікаў Нарады, у шматлікіх каментарыях сусветнай прэсы, на сходах і мітынгах працоўных нашай краіны адзначалася, што ў сваёй прамове Л. І. Брэжнеў яскрава, дакладна вызначыў прынцыповую пазіцыю нашай Камуністычнай партыі, вызначыў асноўныя шляхі развіцця сацыялізма. Гэтая прамова ацэньваецца як вялікі ўклад у распрацоўку стратэгіі і тактыкі камуністычных і рабочых партый.

Адозва ў абарону міру, прынятая Нарадай, заканчваецца словамі: «Адзінства ўсіх прагрэсіўных міралюбівых сіл — загад нашага часу. Згуртаваныя ў адно, мы забяспечым перамогу свяшчэннай справы міру на зямлі!»

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Гэтыя палымяныя словы з Камуністычнага маніфеста, як высокі сцяг нашай праўды, як магутны гімн інтэрнацыянальнай дружбы, маналітнай еднасці, узляцелі ў Крамлёўскім палацы над вялікім форумам камуністаў.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Гэты кліч Маркса і Энгельса магутным, раскацістым набатам прагучаў над усім светам.

У еднасці сіла!

Адзінай згуртаванай сілай, адзінай жалезнай воляй мы зверглі царызм, пабудавалі новае грамадства, зламалі хрыбет фашысцкай пачвары.

З руін і попелу паднялі, адбудавалі, да сонца ўзнеслі новыя вёскі і гарады, фабрыкі і заводы, гіганты прамысловасці і храмы навукі.

І гэту жыццёвую яву, і будучыню ўсяго чалавецтва, мір на зямлі мы зможам адстаяць ад пагрозы атамнай катастрофы адзінствам усіх прагрэсіўных сіл свету, усіх камуністычных і рабочых партый.

Авангард гэтых сіл — нашу Камуністычную партыю — выкаваў Уладзімір Ільіч Ленін. Прамяністымі сваімі ідэямі ён асвятліў нашу дарогу ў будучыню, па якой нас да жаданай мэты вядуць камуністы.

Антон БЯЛЕВІЧ.



Падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу на лепшы мастацкі плакат, прысвечаны У. І. Леніну і Камуністычнай партыі. Конкурс праводзіўся Дзяржаўным камітэтам Савета Міністраў БССР па друку сумесна з Міністэрствам культуры і Саюзам мастакоў Беларусі.

На конкурс паступіла 47 плакатаў. Прэміі атрымалі пяць работ.

Першую прэмію журы прысудзіла плакату І. Радунскага і І. Бланштэйна «Светач камунізма». Другой прэміі ўдастоены плакат мастака Ю. Лягічава «Ленінізм — магутная крыніца нашай сілы», трэцяя прэмія прысуджана рабоце П. Арлова «Ленін».

Заахвочвальнымі прэміямі журы адзначыла работы мастакоў Л. Замаха і І. Радунскага.

На здымку — плакат «Светач камунізма», адзначаны на конкурсе першай прэміяй.

МАСТАК—БАЕЦ ПАРТЫІ

Беларускія мастакі ўважліва сачылі за ходам міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый свету. І ўхваляюць прынятыя на Нарадзе рашэнні і дакументы — канкрэтную і дзейсную праграму дзеянняў усіх прагрэсіўных сіл у імя міру, у імя перамогі ідэй камунізма.

Пралетарскае адзінства, пралетарскі інтэрнацыяналізм самым непасрэдным чынам звязаны з нашай дзейнасцю — дзейнасцю савецкіх мастакоў, байцоў ідэалагічнага фронту.

Мы ведаем, што характэрныя, вядучыя рысы мастацтва ўсяго сацыялістычнага лагера і прагрэсіўнай часткі мастацкай культуры капіталістычных краін грунтуюцца на пралетарскай ідэалогіі і актыўна супрацьстаяць мастацтву буржуазнаму — упадніцкаму, бесперспектыўнаму.

Мы рады быць ідэалагічнымі байцамі партыі.

М. ГУЦІЕЎ,
заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі.

РАЗАМ МЫ НЕПЕРАМОЖНЫЯ

Гэта было амаль паўвеку таму назад. Заканчваўся 1922 год. Краіна рыхтавалася ўрачыста адзначыць пятую гадавіну Вялікага Кастрычніка, пятую гадавіну існавання маладой Савецкай рэспублікі. Да такой важнай гістарычнай падзеі прымеркавана было адкрыццё IV кангрэса III Камуністычнага Інтэрнацыянала. Кангрэс адкрыўся 5 лістапада ў Петраградзе, пасля чаго пераехаў у Маскву.

У той час я быў студэнтам толькі што адкрытага Петраградскага Камуністычнага універсітэта, і мне пашчасліві прысутнічаць на сустрэчы дэлегатаў Кангрэса на Маскоўскім вакзале, а потым на вечары-сустрэчы дэлегатаў у Таўрычаскім Палацы з працоўнымі Петраграда. Сярод дэлегатаў былі ўбеленыя сівізной Клара Цэткін, Марсель Кашэн і іншыя кіраўнікі і прадстаўнікі камуністычных і рабочых партый.

Хоць на Кангрэсе прадстаўлена было 58 розных партый, але многія з іх знаходзіліся яшчэ на шляху станаўлення, былі малалікімі і маламоцнымі.

Цяперашняя ж Маскоўская Нарада, якая нядаўна закончыла сваю работу, як нельга лепш даказала сілу і магутнасць сусветнага камуністычнага руху.

На Нарадзе было прадстаўлена 75 партый, якія выраслі і ўзмацнелі ў барацьбе з імперыялізмам. Як далёка пайшоў наперад камуністычны рух! Магутным аплотам міру стаў лагер сацыялізма. Бурна развіваецца нацыянальна-вызваленчы рух ва ўсіх частках свету...

Сёлетнюю Нараду віталі ўсё прагрэсіўнае чалавецтва, ёй слалі свае найлепшыя пажаданні ўсе людзі добрай волі. І вынікі работы гэтай Нарады былі выдатныя. Яна яшчэ мацней сцэментавала адзінства камуністычных і рабочых партый, натхніла іх на новыя перамогі ў барацьбе з сучасным імперыялізмам.

Гістарычныя дакументы Нарады — вынік калектыўнай творчай думкі — сапраўды неацэнны ўклад у тэорыю і практыку марксізма-ленінізма, баявая праграма камуністычных і рабочых партый на працяглы час. Іх будзе глыбока і старанна вывучаць увесь свет. На доўгія гады яны стануць крыніцай натхнення і энергіі для ўсіх савецкіх людзей.

М. ГАТОЎКІН,
член КПСС з 1920 года, супрацоўнік Гомельскага абласнога краязнаўчага музея.

У ІМЯ ЧАЛАВЕЧНАСЦІ

Я памятаю Беларусь 25 год таму... Разбураныя гарады, спаленыя вёскі, разбітыя бомбамі заводы. Попел вогнішчаў віхурыўся над роднай зямлёй. Здавалася, колькі часу пройдзе, пакуль зможам адбудаваць усё гэта, колькі намаганняў, колькі сіл трэба ўкласці, каб вярнуць нашым гарадам і вёскам той выгляд, які яны мелі да вайны.

Дзякуючы дапамозе партыі і ўрада, дзякуючы братэрскай дапамозе ўсіх савецкіх рэспублік, дзякуючы самаадданай працы кожнага савецкага чалавека, мы не толькі адбудавалі зруйнаванае, мы надалі новы, якасна новы выгляд нашай Беларусі.

Змены ў жыцці беларускага селяніна-калгасніка, рост яго дабрабыту, яго культурных запатрабаванняў паўплывалі і на архітэктуру вёскі. Перад архітэктарамі, будаўнікамі, спецыялістамі сельскай гаспадаркі было пастаўлена пытанне стварэння вёсак новага тыпу, такіх, якія б дапамагалі сцерці сацыяльна-эканамічныя і культурна-бытавыя грані паміж горадам і сялом. І трэба сказаць, што мы шмат чаго зрабілі ў гэтай галіне.

І ці ж можам мы дазволіць каму-небудзь спаліць усё тое, што мы зрабілі за гэтую чвэрць века. Не! Ніколі! І таму з такой увагай, з такой надзеяй сачылі ўсе мы, работнікі самай мірнай прафесіі на зямлі, архітэктары, за Нарадай камуністычных і рабочых партый ў Маскве. Мір! Гэтае слова было галоўным на парадку дня Нарады. І мы, беларускія архітэктары, беларускія будаўнікі, усім сэрцам адгукаемся на гэты заклік.

М. АМЕЛЬЯНЮК,
архітэктар, дырэктар праектнага інстытута «Белгіпрасельбуд».

У ГОНАР ЮБІЛЕЮ НАРОДНАЙ ПОЛЬШЧЫ

Набліжаецца вялікае нацыянальнае свята ў жыцці польскага народа — 25-годдзе з дня Адраджэння.

Гэты юбілей Польскай Народнай Рэспублікі шырока адзначаецца і ў нашай краіне. Па запрашэнні ЦК КПСС у Маскву прыбыла дэлегацыя ПНР на чале з сакратаром Польскай Аб'яднанай Рабочай партыі С. Альшэўскім, якая прымае ўдзел у Днях польскай культуры ў СССР.

Дні польскай культуры пройдуць па ўсёй нашай краіне. Шырока іх адзначыць і грамадскасць Савецкай Беларусі.

Даўняя братэрская дружба звязвае нашы суседнія рэспублікі. Сталі традыцыйнымі сустрэчы беларускіх і польскіх пісьменнікаў, кампазітараў, артыстаў, вучоных, дзеячоў культуры. Нашы народы часта разам адзначаюць многія знамянальныя падзеі ў жыцці сваіх краін.

Адным з мерапрыемстваў, прысвечаных 25-годдзю з дня Адраджэння ПНР, з'яўляецца фестываль польскіх кінафільмаў, які гэтымі днямі пачаўся ў нашай рэспубліцы. На экранах сталічных і абласных кінатэатраў дэманструюцца новыя стужкі кінематаграфістаў братняй Польшчы. Сярод іх мастацкія кінакарціны «Напрамак — Берлін», «Вымушаная прагулка», «Парыж — Варшава» без візы», «Цясніна вядзьмарак», «Воўчае рэха», «Лялька» і іншыя.

Учора ў Мінск прыбыла група дзеячоў польскага кіно. Сярод іх—рэжысёр Ежы Антчак (кіраўнік дэлегацыі), кінаактрысы Ядвіга Бараньска, Ірына Карэл і іншыя.

Госці нашай сталіцы былі прыняты ў Камітэце Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі, сустрэліся з майстрамі беларускага кінамастацтва, зрабілі паездку па выдатных мясцінах горада.

Яны пабываюць таксама на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі Беларускай ССР, у Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, на студыі «Беларусьфільм», сустрэнуцца з мінчанамі — першымі гледачамі фестывалю польскіх фільмаў у беларускай сталіцы.

НА ГАСТРОЛЬНЫХ МАРШРУТАХ

17 чэрвеня газета «Літаратура і мастацтва» расказала пра летнія гастролі тэатраў рэспублікі. Сёння — слова гасцям Беларусі: Ленінградскаму рускаму драматычнаму тэатру камедыі, Нікалаеўскаму рускаму драматычнаму тэатру імя В. Чкалава, якія выступаюць у Мінску, Запарожскаму і Валынскаму музычна-драматычным тэатрам, што гастралююць у Віцебску і Гродна. Вось што расказалі нашаму карэспандэнту творчыя работнікі гэтых калектываў:

80 ТЫСЯЧ ГЛЕДАЧОЎ

Сустрэча адбылася за кулісамі. Нагадваем мастацкаму кіраўніку Ленінградскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра камедыі Уладзіміру Віктаравічу Ускову яго словы, якімі ён закончыў інтэрв'ю, апублікаванае ў нашай газеце 30 мая, напярэдадні гастроляў:

— Гастролі тэатра ў беларускай сталіцы заўяўляюцца. Якое ж у ленінградцаў ўражанне пра мінчан-гледачоў, пра наш горад?

— Гастролі багатыя на нечаканасці. Наш калектыў цяпер пераканаўся, што Мінск — горад тэатральны, а глядач — надзвычай экспансіўны, цікаўны, любіць і добра разумее сцэнічнае мастацтва. А калі ёсць кантакт з гледачом, то і акцёрам лёгка працаваць. Нас прыемна ўразіла і тое, што нават самыя складаныя філасофскія спектаклі карыстаюцца ў мінчан поспехам. А гэта сведчанне высокага густу і культуры гледача.

Працаваць даводзіцца ў Мінску многа. Адначасова выступаем на дзвюх сцэнах. Глядзельныя залы Дома афіцэраў і тэатра оперы і балета кожны дзень перапоўнены. За час гастроляў 80 тысяч мінчан паглядзяць нашы спектаклі.

Калектыў адчувае, што жыхарам вашай сталіцы вядома творчасць М. П. Акімава, нашага выдатнага мастака і рэжысёра. Бяру на сябе смеласць сказаць — нашы спадзяванні збыліся. Тэатр спадабаўся мінчанам. І—з першага погляду!

Адбыліся сустрэчы творчых работнікаў тэатра на трактарным і гадзіннікавым заводах, на паліграфкамбінаце імя Я. Коласа. Мы расказвалі пра творчы шлях тэатра, пра майстроў нашай сцэны, чакалі ўражлівасці са спектаклям. Нам падаравалі многа ласкавых усмешак, кветак, уручылі сувеніры, узнагародзілі гарачымі воплескамі.

У другім ліцейным цэху, дзе праходзіла сустрэча з трактаразаводцамі, адбылося нечаканае. Усхваляваны былі і ліцейшчыкі, і мы, госці. Раптам убачылі, як акцёр нашага тэатра Міхаіл Волкаў кінуўся абдымаць рабочага-ліцейшчыка Уладзіміра Гусаіма. Наш калега ленінградзец Міхаіл Волкаў удзельнічаў у абароне Магілёва на Дняпры ў 1941 годзе, а Уладзімір Гусаім быў абаронцам горада Леніна. Яны сталі цяпер як бы пабрацімамі.

Нашы акцёры пабывалі ў музеях, наведалі гістарычныя мясціны горада. Да мемарыяльнага комплексу ў Хатыні мы разам з акцёрамі Нікалаеўскага тэатра прынеслі букеты жывых кветак... Творчая і баявая дружба родняць мінчан і ленінградцаў.

Самыя светлыя згадкі застануцца ў нашых сэрцах пра мінчан і ваш цудоўны горад-эмагар, горад-працаўнік, дзе так любяць і шануюць мастацтва.

ЧАЦВЁРТАЯ СУСТРЭЧА

Амаль месяц выступае ў Гродна Валынскі абласны музычна-драматычны тэатр імя Т. Шаўчэнкі. Калектыў прыязджае ў Гродна чацвёрты раз. Першы раз тэатр быў тут на гастролях у 1947 г.

— Сёлетнія гастролі ў нас незвычайныя, — гаворыць дырэктар тэатра Канстанцін Кавешнікаў. — Беларускі народ рыхтуецца да вялікага свята 25-годдзя вызвалення рэспублікі ад фашысцкіх акупантаў. Гэтая дарагая і нашым сэрцам дата надае выступленням украінскага тэатра асаблівае гучанне. Незабыўныя сустрэчы калектыву адбыліся на пагранзаставе імя Героя Савецкага Саюза, нашага земляка, Віктара Усава, з хлебаробамі калгаса «Савецкая Беларусь» Шчучынскага раёна, з рабочымі, інжынерна-тэхнічнымі работнікамі абутковай фабрыкі «Нёман», будаўнікамі завода «Капралактам».

Год ад году мацнеюць сувязі з братняй Беларуссю. У рэпертуары нашага тэатра з поспехам ішлі спектаклі па п'есах беларускіх драматургаў К. Губарэвіча, А. Маўзона, А. Макаёнка. Яшчэ і цяпер паказваем на Украіне спектакль па п'есе А. Дзялендзіка «Выклік багам» (у нас ён называецца «Інга павінна жыць»). На рэспубліканскім аглядзе тэатральных калектываў спектакль атрымаў высокую ацэнку журы, а актрыса Вольга Жураўлёва, якая выконвала ролю Інгі, была прэміравана.

Чулі, што К. Губарэвіч і А. Маўзон напісалі новыя творы. Абавязкова напросім даць іх нашаму калектыву.

А пакуль што на сцэне паказваем гродзенцам спектаклі: «Я шукаю цябе» Л. Дэмітэркі і С. Вінакурава, камедыі «На сёмым небе» М. Зарудная і «Вялікае вяселле» А. Бабаяна, трагедыю «У ноч месячнага зацямнення» башкірскага пісьменніка М. Карыма, драму А. Ананьева па матывах твораў В. Кабылянскай «Ваўчыха», «Наймічку» І. Табалевіча і іншыя свае работы.

Кожны вечар зала запоўнена гледачамі. Над касай тэатра нязменна вісіць аб'ява «Усе квіткі проданы».

УДЗЯЧНАСЦЬ

Рэпетыцыя затрымлівалася. Давялося чакаць, пакуль вызваліцца галоўны рэжысёр Нікалаеўскага драматычнага тэатра імя Чкалава, заслужаны дзеяч мастацтваў Украінскай ССР А. Літко. Гутарым з памочнікам рэжысёра, адзным з ветэранаў творчага калектыву Г. Новікавай. Ганна Якаўлеўна ахвотна расказвае, як васемнаццаць гадоў назад нікалаеўцы ўпершыню прыехалі на гастролі ў Мінск. Гэта было ў чэрвені, успамінае яна. І дажджы ішлі, як сёлета.

Галоўнае ж, што запомнілася на ўсё жыццё, цёплы гасцінны прыём мінчан, поспех нашых спектакляў. О, якімі акрыленымі паехалі мы тады з Мінска. Такое не забываецца... А Мінск ваш не пазнаць. Здаецца, што прыехалі ў новы, незнаёмы горад-прыгажун.

— Усе ўкраінцы ўлюбёны ў свой стольны Кіеў, — гаворыць, прышоўшы з рэпетыцыі, галоўны рэжысёр тэатра Анатоль Якаўлевіч Літко.—І ваша сталіца здзіўляе і захапляе сваім непаўторным характарам.

Як праходзяць нашы гастролі? У нас на Украіне гавораць: добра пройдуць гастролі ў сталіцы братняй Беларусі—значыць вытрымаў творчы экзамен. Прызнацца шчыра — боязна было ехаць да вас...

І вось знаёмства адбылося, і не толькі знаёмства. Сярод мінчан знайшлі нямала нашых шчырых сяброў і прыхільнікаў.

З 20-га чэрвеня пачалі паказваць спектаклі адначасова на дзвюх сцэнах — у тэатры імя Янкі Купалы і Палацы культуры прафсаюзаў. Нас радуе, што білеты на спектаклі да канца гастроляў прададзены.

Тэатр выступае ў раённых цэнтрах Мінскай вобласці, у доме адпачынку «Ждановічы». Усяго ў нас будзе 15—16 выязных спектакляў.

Мы ўдзячны мінчанам за ўвагу, за цёплы прыём. Спадзяёмся замацаваць дружбу і пабываць у гасцінным горадзе яшчэ не адзін раз.

АНШЛАГІ

Да тэлефона падышла актрыса Запарожскага дзяржаўнага ўкраінскага музычна - драматычнага тэатра імя М. Шчорса Тамара Дзмітраўна Вольская.

Тамара Дзмітраўна расказала, як праходзяць гастролі шчорсаўцаў у Віцебску.

— У горадзе над Дзвіной выступаем упершыню, — гаворыць яна. — Увесь наш калектыў у захапленні ад гасціннасці віцяблян. Спектаклі праходзяць з аншлагам. Гэта вядома, радуе.

Гастролі адкрыліся драматычнай паэмай «Яраслаў Мудры» І. Качаргі. Падзеям Вялікай Айчыннай вайны прысвечаны спектаклі «Суд маці» і «Калі мёртвыя ажываюць» І. Рачады. Поспехам у гледача карыстаюцца спектаклі ўкраінскага класічнага рэпертуару — «У надзею рана зелле збірала» па аповесці В. Кабылянскай, «Цыганка Азая» М. Старыцкага, «Грэх і пакаянне» І. Карпенкі-Карага, «Наталка-Палтаўка» І. Катлярэўскага. Артыстаў радуе тое, што гэтыя творы здаўна ведаюць у Беларусі, і новыя пакаленні гледачоў з нязменным захапленнем сустракаюць вобразы, якія некалі ўзрушвалі іх бацькоў і дзядоў. Ставім мы і музычныя камедыі савецкіх аўтараў «Севастопальскі вальс» Я. Жаркоўскага і «На світанні» А. Сандлера. Нарадзіваем многа вызыных спектакляў у раённых цэнтрах і калгасах вобласці.

Сустрэча з роднай Беларуссю мяне асабліва хвалюе, бо сама я нарадзілася на Магілёўшчыне. Вучылася ў Мінску ў тэатральным інстытуце. Пасля яго заканчэння тры гады працавала ў Пінскім тэатры. Даўно гэта было. Але ніколі не забудуцца першыя кроні ў мастацтве, якія зрабіла на беларускай сцэне. Удзячнасць маім настаўнікам жыве ў сэрцы і па сённяшні дзень.

З першага ліпеня наш тэатр будзе выступаць у Гомелі. Каб жа такі поспех, як у Віцебску, спадарожнічаў нам і ў Гомелі...

ЖАНРУ АПАВЯДАННЯ— УВАГУ І ПАДТРЫМКУ

З пасяджэння прэзідыума праўлення Саюза пісьменнікаў БССР

Як мы паведамлялі ўжо, 19 чэрвеня адбылося чарговае пасяджэнне прэзідыума праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, на якім была прадоўжана гаворка пра сучасны стан беларускай навелістыкі, пачатая на старонках газеты «Літаратура і мастацтва» артыкулам крытыка Васіля Бурана «Вялікія праблемы малога жанру».

Вакол артыкула і пачалася на старонках газеты гаворка пра сучасны стан нашага апавядання, якая цягнулася каля трох месяцаў і ў якой прынялі ўдзел крытыкі, пісьменнікі і чытачы. У дыскусійных артыкулах быў закрануты шэраг пытанняў, якія тычыліся сучаснага стану і далейшага развіцця апавядання.

З ацэнкі і падсумавання вынікаў гаворкі, што адбылася на старонках газеты «Літаратура і мастацтва», пачалася і размова пра апавяданне на пасяджэнні прэзідыума праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. Пачаў яе сакратар праўлення Іван Мележ.

— На сённяшнім нашым пасяджэнні, — гаварыў ён, — мы павінны падвесці вынікі газетнай дыскусіі, дагаварыць тое, што было ў ёй недагаворана. На старонках «Літаратуры і мастацтва» выступіла адзінаццаць чалавек. Сярод іх — крытыкі В. Буран, В. Жураўлёў, В. Каваленка, С. Андраюк, Я. Герцовіч, А. Яскевіч, П. Дзюбайла, празаік І. Навуменка, кінааператар кінастудыі «Беларусьфільм» В. Поляк, аспірант Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага Я. Адамовіч, настаўнік з Пухавіцкага раёна Б. Зубкоўскі. Ужо ў гэтым пераліку кідаецца ў вочы адна прыкрая і не вельмі зразумелая акалічнасць: пры добрай актыўнасці нашых крытычных сіл у дыскусіі прыняў удзел толькі адзін прадстаўнік цэха апавядальнікаў — І. Навуменка. Такая няўвага, калі не абыякавасць саміх апавядальнікаў да надзённых праблем «малой прозы» засмучае. Тым не менш агульнае ўражанне ад дыскусіі прыемнае. Галоўнае тое, што большасць выступленняў было прасякнута сур'ёзным жаданнем разабрацца ў становішчы беларускага апавядання на сучасным этапе.

У дыскусіі, працягвае І. Мележ, адзначаліся і поспехі, якіх дасягнулі нашы празаікі розных пакаленняў у жанры апавядання. Асабліва былі адзначаны поспехі нашых маладзейшых апавядальнікаў. Шмат добрага, напрыклад, было сказана ў дыскусіі пра Вячаслава Адамчыка як пра арыгінальнага празаіка. Належным чынам ацэнены і поспехі другога маладога празаіка — Міхася Стральцова.

— Да асабістых дасягненняў гэтага апавядальніка, — падкрэслівае прамоўца, — я мог бы аднесці вельмі важнае, па-мойму, для нашай літаратуры апавяданне «Свет Іванавіч, былы донжуан». Я лічу, што гэтае апавяданне вельмі важнае таму, што яно падымае ў нашай літаратуры тэму тонка замаскаванага сучаснага мяшчанства, якое прыстасоўваецца да нашага часу.

Гаворачы аб тым, што ўдзельнікамі дыскусіі шмат увагі было аддадзена творчасці нашых маладзейшых празаікаў А. Кудраўца і М. Капыловіча, І. Мележ адзначае, што тут не абышлося і без некаторых памылковых сцвярджэнняў, што асобным творам была дадзена занадта высокая ацэнка. У прыватнасці, неблагое само па сабе апавяданне М. Капыловіча «Пустальга» ўсё ж не варта, на думку прамоўцы, таго захапленння, з якім пісалі пра яго крытыкі.

— Кажу гэта толькі для таго, — гаворыць І. Мележ, — каб перасцерагчы самога М. Капыловіча ад няправільнага разумення сваіх магчымасцей. Думаецца, што для самога маладога празаіка куды больш важнае значэнне мае апавяданне «Хлеб» з яго вельмі добрым разуменнем народнага побыту, разуменнем нашых людзей, а таксама апавяданне «У ружовым тумане», якое ўдзельнікі дыскусіі крытыкавалі. Апошняе апавяданне цікавае тым, што ў ім М. Капыловіч здолеў заўважыць сутыкненне лепшых чалавечых якасцей са скнарлівасцю, жорсткасцю, душэўнай чэрствасцю. Ужо сама пастаноўка некаторых псіхалагічных праблем у гэтым апавяданні заслугоўвае ўвагі. Падтрымліваю я і спробы М. Капыловіча ставіць надзённыя пытанні з жыцця сельскай інтэлігенцыі.

Далей прамоўца спыняецца на артыкулах А. Яскевіча, В. Каваленкі, Я. Герцовіча, І. Навуменкі. Многія з гэтых аўтараў адзначаюць як адметную асаблівасць нашага апавядання тое, гаворыць прамоўца, што ў ім пісьменнікі асаблівую ўвагу звяртаюць на маральна-этычны пачатак у жыцці нашага грамадства. З гэтым нельга не пагадзіцца. Гэтую зацікаўленасць маральнай каштоўнасцю чалавека можна вытлумачыць тым, што мы жывём у эпоху, калі да кожнага чалавека прад'яўляюцца большыя, чым калі-небудзь раней, запатрабаванні. Такая патрабавальнасць вынікае з самой сутнасці камуністычнага грамадства, якое будуе сёння савецкі народ.

І. Мележ даволі падрабязна спыняецца на праблеме героя сучаснага апавядання, якую закраналі многія ўдзельнікі дыскусіі, у прыватнасці, В. Буран, С. Андраюк, А. Яскевіч. В. Буран у сваім артыкуле, гаворыць прамоўца, пісаў: «Не можа не трывожыць арыентацыя некаторых пісьменнікаў на «маленькага чалавека» з яго абмежаваным светапоглядам, старэчасцю душы і пачуццяў». Яму пярэчыў С. Андраюк: «Сёння, шчыра кажучы, неяк зусім не ўспрымаюцца творы, у якіх асноўным героем з'яўляецца «вялікі чалавек» (у сэнсе антыподу «маленькаму чалавеку»)». Адзначыўшы, што пытанне гэтае надзвычай важнае і складанае, І. Мележ гаворыць, што спрэчка апанентаў па дыскусіі насіла пэўны схаластычны характар, разважанні аўтараў артыкулаў былі занадта агульныя і не зусім ясныя.

— Мне здаецца, — заўважае прамоўца, — што В. Буран, гаворачы пра «вялікага чалавека», не лічыць, быццам нашай літаратуры не трэба паказваць чалавека радавога, звычайнага, што яе героем павінен абавязкова быць нейкі асаблівы чалавек. Крытык выступае, на мой погляд, за «вялікага чалавека» ў тым сэнсе, што героем нашых твораў павінен быць чалавек шырокіх поглядаў, што герой гэты павінен быць дзейснай асобай, што радавога, звычайнага чалавека трэба паказваць буйным планам. С. Андраюк адстойвае права літаратуры на паказ «маленькага чалавека» з усімі яго радасцямі, турботамі і клопатамі. І вось тут, я лічу, узнікае пытанне аб тым, якога героя трэба лічыць «вялікім», а якога «маленькім». Уся справа, відаць, у тым, каб навучыцца бачыць у праявах будзённага, звычайнага нешта вялікае, істотнае. Літаратура не мае права абыходзіць тыя праблемы, якія ўзнікаюць у паўсядзённым чалавечым, на першы погляд малапрыкметным, жыцці. Нельга звужваць задачы літаратуры. Яна павінна бачыць і паказваць людзей ва ўсёй складанасці, у ёй павінна быць месца і «вялікім» героям, і «малым».

Слушныя заўвагі, працягвае прамоўца, выказаў у сваім артыкуле «Ненатоленая прага духоўнасці» В. Каваленка, які гаварыў аб духоўным напаўненні герояў апавяданняў. Так, героі нашых твораў павінны быць духоўна багатымі. Аднак пахваліцца гэтым мы пакуль што не можам, заўважае І. Мележ. Ад-

(Заканчэнне на 3-й стар.)



У новым горадзе на карце рэспублікі Новалукомлі нядаўна ўступіў у строй дзеючых гандлёвы цэнтр. У прасторным светлым памяшканні ёсць і кніжны аддзел. У ім вялікі выбар палітычнай і мастацкай літаратуры на беларускай і рускай мовах.

На гэтым здымку вы бачыце старшага прадаўца Яніну Ласкіну, якая дапамагае пакупнікам у выбары літаратуры.

Фота М. МІНКОВІЧА.

© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

ДА 25-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ

КАЛІ МАЛАДЗЕЕ ЗЯМЛЯ

КАЛГАС «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» ПАСПЯХОВА ВЫКОНВАЕ ПЯЦІГОДКУ КУЛЬТУРЫ І БЫТУ





На манеце новы калгасны пасёлак выглядае такім, нібы глядзіш на яго з акна самалёта. Нават самая буйная «кропка» на ім, вось гэты Палац культуры (злева), выглядае як два запалкавыя карабкі. Раснянская музычная школа будзе мо яшчэ большай. Ва ўсякім разе фасад яе ў два з палавай разы большы, чым палацавы. На здымку справа — фрагмент фасада будучай музычнай школы (праект).

ГЭТЫ кірмаш не быў падобны на тыя, што колісь віравалі ў святы ў беларускіх мястэчках: з арэлямі і каруселямі, цыганамі і мядзведзямі, з бойкімі скарагаворкамі-прыгаворкамі, з пахваламі — у склад ды ў лад — свайму няхітраму тавару, сваім вырабам-самаробкам — «пеўнікам» і пернікам, лыжкам і цабэркам, гаршкам і глякам, абрусам і палотнам, ліпавым — «зносу няма!» — лапцям, вяроўкам і распісным, з шамкамі і бомамі дугам...

Не, гэты кірмаш быў не такі, хоць народу на ім было не толькі з Расны, а і з суседніх вёсак, хоць і цяперашніх «коней» было многа — чароды матацыклаў, шэрагі аўтамашын, ледзь не сцірты веласіпедаў. Ды і чаму б не ехаць «машынерыяй», калі дарога ў цэнтр калгаса «хоць бокам каціся» — асфальт...

І хіба можна было параўнаць тое, што навезлі ў калгас прадаваць гандлёвыя арганізацыі Брэста, Камянца, Высокага! Тэлевізары і халадзільнікі, радыёлы і пральныя машыны, матацыклы і веласіпеды, дываны і палавікі, адзенне і абутак самых новых фасонаў, усялякая, якая толькі ёсць на свеце, тканіна, галантарэя, парфюмерыя, кнігі і цацкі...

А размовы, размовы каля тавараў! Мо даўней сяляне так не разбіраліся ў конях і каровах, як цяпер у тэлевізарах і пральных машынах. Каб у тэлевізары і экран быў шырэйшы, каб і наладка была аўтаматычная, каб і тэмбр гуку можна было рэгуляваць...

Брэсцкая абутковая фабрыка збірала водгукі на выстаўку свайго абутку. Мадэльеры і манекеншчыцы паказвалі на сцэне палаца свае новыя мадэлі моднай вопраткі. Тут жа, у зале, прымаліся заказы на аблюбаваныя сукенкі, гарнітуры...

Толькі дарагіх дываноў было прададзена каля трохсот, сотні метраў тканін... А ўсяго за паўдня розных тавараў на сто тысяч рублёў.

Вось так, нібы між іншым, узялі і выклалі калгаснікі сто тысяч рублёў!

Назаву некалькі лічбаў, якія падкажуць, адкуль такая заможнасць. Летась сельгасцэлюлозны атрымала два мільёны рублёў прыбытку — на восемсот рублёў больш, чым у першым годзе пяцігодкі. На кожны чалавека-дзень выдадзена ў сярэднім на чатыры рублі.

На круг у калгасе даўно збіраюць па дваццаць і больш цэнтнераў збожжа, а сёлета плануюць атрымаць 26. Ад кожнай каровы тут надойваюць па тры-чатыры тысячы кілаграмаў малака. Дзяржаве штогод прадаецца больш трох мільёнаў кілаграмаў малака. Многа гэта ці мала? Мяркуйце самі: чыгуначны састаў з васьмідзесяці цыстэрн па сорак тон у кожнай. Малочная рака, хоць пракладвай малакапровод...

Яшчэ ў сярэдзіне леташняга года быў выкананы пяцігадовы план па продажы малака. Да канца пяцігодкі будзе «зроблен» яшчэ адзін такі план. А пяцігодку па продажы мяса выконваюць к 1-му ліпеня г. г., па збожжы і іншых прадуктах раслінаводства — к канцу года.

Не буду ўдавацца ні ў гаспадарчы разлік, які стаў галоўным метадам гаспадарання, ні ў племянную-селекцыйную работу на фермах, ні ў штогадовае выпрабаванне і абнаўленне гатункаў сельскагаспадарчых культур, ні ў механізацыю ўсіх галін гаспадаркі. (у арцелі ўжо каля ста трактараў, аўтамашын, камбайнаў). Для ўсяго гэтага спатрэбілася б многа старонак. Прыведзеныя лічбы добра характарызуюць матэрыяльна-тэхнічную базу калгаса. На яе, гэтую трывалую базу-падмурак, і апіраецца праўленне калгаса, перабудоўваючы вёску, жыццё, быт людзей і культуру.

ЗНАМЕЧАНЫХ на пяцігодку дзесяці шматкватэрных дамоў з усімі камунальнымі выгодамі (цэнтральнае ацяпленне, гарачая і халодная вада, каналізацыя, санвузел і ванная, газ) пабудавана восем. Два дамы ўжо абжыты, астатнія хутка прымуць навасёлаў. Усяго ў новым пасёлку будзе жыць каля 1500 чалавек.

Самым цікавым жылым домам я лічу чатырохкватэрны для ветэранаў калгаснай працы, маласямейных пенсіянераў. Ён будуецца па праекце інстытута «Белгіпрасельбуд». Што ў кватэрах створаны ўсе зручнасці, пра гэта і гаварыць не трэба. Пасярэдзіне дома — прасторны хол. Тут будуць мяккія крэслы, тэлевізар, камін.... Так, і камін, хоць ёсць і цэнтральнае ацяпленне. Цяпер уявім: цёпла, светла, утульна, патрэсквае агонь у каміне. Сядзяць старыя, успамінаюць цяжкія дні мінулага, франтавыя паходы, пасляваенныя пяцігодкі...

Я застаў у гэтым доме старшага архітэктара «Белгіпрасельбуда», аднаго з аўтараў праекта дома Л. Нардштэйн. Прыехала для аўтарскага нагляду, а заадно падказаць, як лепш афарміць той жа камін, лепш спланаваць дапаможныя памяшканні, каб было зручна і прыгожа. Дом, як і іншыя будынкі, узводзіць Высокаўскі «Міжкалгасбуд», але ў калгасе ёсць і свая будаўнічая брыгада, ёсць прараб Пётр Якаўлюк, яны таксама памагаюць.

Увогуле, у калгасе ўжо цяжка знайсці вёску, дзе б не былі абноўлены ўсе будынкі або пабудаваны новыя. Старшыня сельсавета Таіса Карпаўна Рассыпная ўспомніла, што ёсць дзве старыя хаты ў Вярхах. Адну адрамантуюць, адну знясуць — у ёй ужо ніхто не жыве. Нядаўна сельсавет прыняў рашэнне: назваць усе вуліцы Расны, устанавіць нумарацыю дамоў. Вельмі ж цяжка стала працаваць паштальёнам. Тры новыя вуліцы ў Расне назвалі Кастрычніцкай, Юбілейнай і Інтэрнацыянальнай.

Таіса Карпаўна з захапленнем расказвае, што і сельскі Савет, яго пастаянныя камісіі ўключыліся ў вялікі паход за павышэнне культуры калгаснай вёскі, за камуністычны быт. Не адноўмы гэтыя пытанні выносіліся на пасяджэнні выканкомаў, на сесіі. Усе калгаснікі спаборнічаюць — двор з дваром, — у каго будзе самая прыгожая сядзіба. І люба паглядзець летам на іх двары — чыста, акуратна, многа зеляніны і кветак, утульна і прыгожа ў кватэрах. Кожны год падводзяцца вынікі гэтых спаборніцтваў, аб'яўляюцца пераможцы.

Мы спрабавалі з ёю палічыць усіх інжынераў, аграномаў, настаўнікаў, якія скончылі школы, размешчаныя на тэрыторыі сельсавета, і тых інтэлігентаў, якія зараз працуюць у калгасе. Аказалася, што гэта — дужа цяжкая справа. Такая ж няўдача спасцігла нас, калі паспрабавалі падлічыць усе тэлевізары і матацыклы.

САМАЕ любімае дзіця калгаснай пяцігодкі культуры і быту — палац. У гэтага будынка незвычайныя формы і памеры, аддзелка і абсталяванне. Летась, калі палац толькі адкрылі, да яго было цэлае паломніцтва. Прыязджалі старшыні суседніх калгасаў, партыйныя і савецкія работнікі з Брэста і Мінска, удзельнікі Усесаюзнай нарады па сельскім будаўніцтве, журналісты. Здзіўляліся, ахалі, прыкідвалі, ці патрэбны вёсцы такія будынкі.

Старшыня калгаса Уладзімір Бядуля часта задаваў дапытлівым «наіўнае» пытанне:

— А хто сказаў, што на сяле павінна быць горшае і меншае, чым у горадзе? Мы «агітуем за камунізм» канкрэтнымі рэчамі.

І вёў чарговую экскурсію па палацы. У адну з іх трапіў і я.

— Гляньце на фасад. Няма класічных калон з капітэлямі, няма порцікаў. Шкло і бетон. Шкляныя плоскасці на вышыні другога і трэцяга паверхаў надаюць будынку ўрачыстасць.

Праз шкляныя, з тоўстых лістоў, дзверы заходзім у палац. У вестыбюлі разбягаюцца вочы. На што глядзець — ці на мазаіку каляровага бетону пад нагамі, ці на лесвіцы, што вядуць адна на другі паверх, а другая ў цокальны? Адмысловыя лесвіцы: парэнчы з чорнага, як смоль, пластыку, рашотка — нікеляваная. Ля лесвіцы — куточак «зімовага саду». Зеляніна экзатычных паўднёвых раслін і кветак цікава спалучаецца з акантоўкай гэтага кветніка грубымі, «дзікімі» камянямі.

— Звярніце ўвагу на калоны, — паказвае Бядуля. — Абліцоўвалі іх лепшыя мармуршчыкі Мінска.

Пліты са светлага мармуру так прыгнаны адна да адной, што няма шчыліны і на волас. Вышэйшы шык пры абліцоўцы — канты маюць трохвугольныя пазы-выемкі абсалютнай геаметрычнай формы.

— Тэатр пачынаецца з вешалкі, здаецца так гаварылі класікі? — пытае Бядуля і вядзе ўсіх уніз.

Цокальны паверх — прасторны хол з калонамі, абліцаванымі маёлікай, — заліты дзённым святлом, адна сцяна аздоблена драўлянымі ясеневымі плітамі, за стойкай бліскаць нікелем вешалкі. Яшчэ адна сцяна люстраная.

— На сутарэнне, здаецца, і не падобна, — іранізуе старшыня. — А ведаеце, на адной калоне абліцоўшчыкі схалтурылі. Дык я ім і сказаў: «Не-е, браточкі, не падумайце, што ў сяле вам гэта сыдзе з рук. Сядзьце, рассартуйце ўсе плітачкі па колеры і памеры, калі трэба — тыдзень сядзіце, мы вам за гэта заплацім. Але зрабіце так, як трэба». А як жа інакш! Каб выхоўваць у калгаснікаў разуменне прыгожага, трэба пачынаць з самік будаўнікоў...

Экскурсанты аглядалі «халтурнае месца»: у чатырох радах маёлікавыя пліткі былі пакладзены на які міліметр вышэй ці ніжэй, астатняе ж усё — мо з мікроннай дакладнасцю.

На другім паверсе госці звычайна аглядалі банкетную залу на трыста месц, дзе блішчэў, нібы люстэрка, паркет, чытальню, абсталяваную паліраванай мяккай мэбляй, і ўрэшце — глядзельную залу.

— Сядайце, сядайце, — рассаджваў ён экскурсантаў. — Можаце займаць любое з 520 месц, бачнасць адусюль выдатная. Гэтыя тэатральныя крэслы ў нас часова, з цягам часу замест іх паставім мяккія... Сцэна вялікая, сучасная, на ёй нікому не цесна. Сцэна з хітрынкай: аркестравая яма закладваецца разборнымі шчытамі, карысная плошча яшчэ больш павялічваецца.

І нарэшце доўгі калідор. Дзверы, дзверы, дзверы... З-за адных чуюцца гукі рояля, з-за другіх — домры, з-за трэціх — баяна. Гэта займаецца ў палацы, пакуль яшчэ не пабудавалі асобнага будынка, Раснянская музычная школа. І смешна было глядзець, як самавітыя госці, надрабляючыся пад старшыню, стараліся ісці на дыбачках, гаварыць шэптам.

Старшыня расказаў, што школай кіруе заслужаны дзеяч культуры БССР самадзейны кампазітар Міхаіл Солапаў (ён жа і мастацкі кіраўнік палаца), а ўсяго ў музычнай школе працуе адзінаццаць выкладчыкаў, займаецца тут больш ста дзяцей калгаснікаў па дзесяці спецыяльнасцях — фартэпіяна, баян, акардэон, домра, балалайка, гітара, труба, трамбон, кларнет, валторна. А спачатку было і смех і грэх: прывядуць бацькі малога і абавязкова патрабуюць, каб вучылі на баяніста. Розныя там домры, трубы і прызнаваць не хацелі. Вядома, даводзілася тлумачыць, што і да чаго. Малыя не толькі вучацца, але ўжо і іграюць у ансамблях баяністаў і акардэністаў, у духавым аркестры. Слухаюць іх бацькі і не нашчадзіцца.

Не толькі музычная школа займаецца ў палацы. Нядаўна закончыў першы навучальны год калгасны ўніверсітэт культуры. Адно з заняткаў праводзілі лепшыя мадэльеры Брэста — «Прыгожа і з густам апранацца — патрабаванне часу». Па просьбе слухачоў на новы навучальны год запланаваны заняткі — «Ці ўмееце вы з густам абстаўляць кватэру?», «Як правільна і прыгожа сервіраваць стол» і іншыя. У асноўным жа ўніверсітэт мае музычны ўхіл. Вучылі сёлета калгаснікаў разумець музыку, знаёмілі з народнымі музычнымі інструментамі, расказвалі пра жанры вакальнай музыкі, пра народныя песні, песні рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. З кожным годам праграма універсітэта будзе ўскладняцца.

ЦІКАВАЯ мастацкая самадзейнасць палаца. Перад самым маім прыездам у калгасе адбылася прэм'ера «Паўлінкі». Паставіла камедыю метадыст абласнога Дома народнай творчасці Т. Пятніцкая. Я застаў толькі «рэха» ад той пастаноўкі. Усе ўспаміналі спектакль і захапляліся: «Не горш, чым у прафесіяналаў».

Я веру ў раснянцам, бо заслужыць іх пахвалу нялёгка. Гэта людзі, якія бачылі выступленні артыстаў Масквы, Ленінграда, Кіева, Горкага, Варонежа, лепшых беларускіх калектываў.

Я веру ў раснянцам, бо ведаў большасць выканаўцаў роляў у «Паўлінцы»: Быкоўскага — калгаснага тэхніка па газе Івана Калесніка, Паўлінку — загадчыцу дзіцячага сада Ліду Лазарэнка, Якіма Сароку — выкладчыка фізкультуры Ваўковіцкай сярэдняй школы Івана Драпуна, Крыніцкага — дырэктара той жа школы Аляксея Царука, Пустарэвіча — дырэктара Лумянскай васьмігодкі Васіля Дзенісенку, Агату і Альжбету — настаўніц Валянціну Кужалеву і Веру Камарчук. Сакавітыя, мусіць, у іх атрымаліся вобразы, бо і самі выканаўцы людзі таленавітыя, з высокім густам.

Хор палаца — не проста хор. У рэпертуары яго ўжо больш 70 песень, амаль усе яны спяваюцца акапэльна. У калгасе жартуюць: скора калектыў стане сапернікам шырмаўскай капэлы. Жарты жартамі, а выканаўчае майстэрства хору вельмі высокае, ён не раз удзельнічаў у аглядах, у дэкадах самадзейнага мастацтва.

...Звычайна працуе з хорам сам М. Солапаў. На гэты раз ён быў у кансерваторыі, і рэпетыцыю праводзіў Мікалай Мілкоўскі: збіраліся заўтра выязджаць з канцэртам, пад Беларэвежу, у Камянюкі.

Самы першы прыйшоў на рэпетыцыю даяр Мікола Салышка. Сем гадзін вечара, некалькі мінут на восьмую... Хвалюецца Мікола, і такое шчырае, непасрэднае яго хваляванне, што міжволі ўсміхаешся і захапляешся гэтым хлопцам. Да арміі ён таксама працаваў даяром, пасля службы зноў вярнуўся да любімай работы. Узяў горшую групу кароў, а цяпер на ўдоях яны амаль такія ж, як у калгаснай знакамітасці, Героя Сацыялістычнай Працы Любові Нічыпарук.

Ці даўно спявае ў хоры? Усміхаецца: «З чатырнаццаці гадоў». А ў арміі не кідаў гэтае захапленне? «Што вы!» А чаму працуе даяром? «Дык жа цікава! У нас дояць усяго два разы, механізацыя... А вы ведаеце, якая ферма будзе пабудавана? У-у-у... Каруўнік — шасцірадны, малако адразу ў пакецікаў будзе адпраўляцца ў магазіны...»

За акном трашчаць матацыклы. Прыехалі калгасны тэхнік па газе Іван Калеснік і загадчык Лумянскай малочна-таварнай фермы затэхнік Уладзімір Дзік. Мікола Салышка радуецца, бы дзіцёнак. І вось ужо спявае трыо: званочкам заліваецца Мікола, заўзята цягне Іван, гудзе-ракоча Уладзімір...

Пакуль спяваюць яны, пад'язджаюць на веласіпедах, матацыклах, машынах іншыя, падкочвае калгасны аўтобус — ён збіраў харыстаў у аддаленых вёсках.

Тишина, тишина, тишина...
Мы хотим, чтоб она никогда не кончалась...

Гэта спявае ўжо вакальны ансамбль, да хлопцаў далучыліся бібліятэкарка Ніна Андрасюк, піянерважатая Вольга Стрыхарчук, служачая Вольга Сачык...

Спаважна рассаджваюцца харысты — паляводы, жывёлаводы, настаўнікі, маладыя і пенсіянеры. На старых аматараў песні — сівавусага, сухарлявага Васіля Капу, персанальнага пенсіянера Аляксандра Мінюка, братоў Мікалая і Аляксандра Карпукоў глядзець асабліва ўсцешна: як урачыста займаюць яны свае месцы, адкашліваюцца, як дружна цягнуць «для размінкі» гамы!..

А потым пайшлі — «Радзіма» Алоўнікава, «Што то за хлопец» Багатырова, «Белеет парус одинокий» Свешнікава, народная «Ой, зелена, зелена», «Думы мае» Шаўчэнкі...

Канчаецца рэпетыцыя пад поўнач, грузавік і аўтобус зноў развозяць самадзейнікаў па дамах. Жартуюць спевакі да такіх клопатаў: «Чаму ж нам не пець, чаму ж не гудзець...»

ПРА КАЛГАСНЫЯ СВЯТЫ варта расказаць асобна.

Мо самае вясёлае — Новы год. 31-га снежня тройкі, упрыгожаныя стужкамі, вянкамі, званочкамі, з'язджаюцца ў Расну, у цэнтр калгаса. Ад кожнай брыгады — па тройцы з пераапранутымі каляднікамі. Каго тут толькі няма! Ведзьмы, чэрці, бабы-Ягі, козы, скамарохі, музыкі... Кожную тройку сустракаюць жартамі і смехам, старающа зганіць іх уборы. І вось з'яўляюцца дзед Мароз і Снягурачка, віншуюць усіх з Новым годам, садзяцца на першую тройку. Карагоды і танцы на снезе спыняюцца, «поезд» бярэ кірунак на бліжэйшую вёску.

У кожнай брыгадзе свой сюрпрыз дзеду Марозу і яго свіце. То раптам заступае дарогу пагранічнік з сабакам, патрабуе прад'явіць дакументы, то выходзяць пушкінскія дзед і баба з разбітымі ночвамі, просяць абнавіць ім пасудзіну, то з ласкавым паклонам з'яўляюцца беларускія Лявон з Лявоніхаю, з караваем і соллю. У кожнай вёсцы дзеда Мароза, Снягурачку і світу чакаюць, дзед раздае дзецям падарункі, а дарослым — вішаванні, жадае ўсім здароўя, багацця, густога прыплоду ў хлявах, вялікага намалоту ў полі. Тут жа адбываюцца імправізаваныя канцэрты. І зноў звіняць бомы і званочкі, як гогалеўскія птушкі-тройкі, ляцяць сані, ажно сцелюцца ў аглоблях коні, зноў ад сяла да сяла нясуцца песні...

Падвечар усе збіраюцца ў Расне, каля галоўнай ёлкі. Пачынаецца снежны баль-маскарад. Спецыяльнае журы, зацверджанае праўленнем, прысуджае прэміі за лепшыя касцюмы.

Першага студзеня гулянне працягваецца, толькі абсягі яго пашыраюцца. Тройкі заязджаюць у суседнія калгасы, у райцэнтр, а то і ў Брэст.

Зусім нядаўна ўдзельнічалі калгаснікі ў святкаванні 950-годдзя Брэста. На вуліцах старажытнага горада, на стадыёне нібы прайшла перад гледачамі ўся гісторыя краю. То выязджалі ў дазор тры асілкі-багатыры на неспакойных стаенніках — калгаснікі з «Савецкай Беларусі» Іван Лящчук, Мікалай Карпук і Аляксандр Аліфярук. То ішлі рускія ратнікі-воіны ў шлёмах і кальчугах са шчытамі і мячамі, то рускі конны дазор (экіпаж калгаса Васіль Рудчанка і заатэхнік Мікалай Целеш) вёў на вяроўцы палонных «татар». Паказвалі на прадстаўленні раснянцы і куляметную тачанку з «максімам». Кіраваў ёю калгасны каваль Уладзімір Вішанька.

На калгасным свяце «Залатая восень».

Адно з любімых свят — «Залатая восень». У калгасным палацы ладзяць выстаўку дарункаў зямлі, кожная брыгада выбірае лепшую каравайніцу і пячэ конкурсны каравай. Пераможцам прысуджаюцца прэміі. Потым гулянне пераносіцца на ўлонне прыроды. Спаборнічаюць удзельнікі самадзейнасці, наладжваюцца гульні, атракцыёны. Кульмінацыя свята — сустрэча каралевы «Залатая восень». Аднойчы яна прыляцела... на верталёце! Адчыніліся дзверы, на дол саскочыла чырванашчокая маладзіца ў казачных уборах. Кінуліся сустракаць яе з караваямі, пачалі фатаграфіраваць. «Матухны!» — ахнулі цёткі. — Дык гэта ж Варвара Трацюк з бардзёўскай брыгады, наша лепшая свінарка...».

Для калгаснай дзетвары піянерскі лагер «Зорачка» — другі родны дом.

Летам — свята песні і працы. Агляд гатоўнасці тэхнікі да ўборкі. Героі гэтага свята — механізатары. У канцы лета — дажынкі. Дзяўчаты стараюцца не ўпусціць момант, бо не застанецца нажаць апошні снапок. Гэты снапок у калгасе завуць «кветка-перапёлка». Яго ўпрыгожваюць кветкамі, каляровымі стужкамі.



Цяжка ў гэтых рускіх воінах, якія ўдзельнічалі ў святкаванні 950-годдзя Брэста, пазнаць калгаснага экіпаніста Васіля Рудчанку і заатэхніка Мікалу Целеша.

У гэты час з новага хлеба пячэцца каравай. І «кветку-перапёлку» і каравай вязе ў канторы калгаса на камбайне лепшы камбайнер, пераможцы спаборніцтва на жніве. Ля канторы яго ветліва сустракаюць старшыня калгаса, праўленцы, прымаюць рапарт і каштуюць механізатарскі дарунак, дзякуюць за самаадданую працу. Вечарам у банкетнай зале Палаца культуры накрываюцца сталы. Калгас аддае належнае працоўнаму подзвігу механізатараў — галоўнай сіле арцелі...

Можна было б шмат расказваць пра тое, як урачыста і весела святкуюць тут Першае мая і 7 лістапада — усенародныя святы, як урачыста праводзяць у армію навабранцаў, як наладжваюць камсамольскія вяселлі, рэгістрацыі дзяцей. Нядаўна было камсамольскае вяселле палявода Ніны Наймук і трактарыста Івана Кучука. У час урачыстай рэгістрацыі шлюбу ў палацы «страляла» шампанскае, гучаў «Вальс маладажонаў» у выкананні ансамбля баяністаў, былі і віншаванні, і падарункі. Праўленне калгаса падаравала новай сям'і сервант. Гасцей вазіў калгасны аўтобус...

Завадатары ўсіх гэтых свят — калгасныя камсамольцы. Людзі няўрымслівыя, маладыя гаспадары зямлі.

КОЖНЫ аўторак і чацвер, у 15 гадзін дня ў кантору збіраюцца брыгадзіры, загадчыкі фермаў, спецыялісты на нараду. Самыя розныя пытанні вырашаюцца на гэтых нарадах, якія часам ператвараюцца ў пасяджэнні праўлення. І гаспадарчыя, і культмасавыя — як правесці чарговае свята, канцэрт мастацкай самадзейнасці, каму выдаць пуцёўку ў дом адпачынку ці ў санаторый, каго паслаць у чарговае турысцкае падарожжа.

На гэтых пасяджэннях абмяркоўваецца і вучоба дзяцей у школе, і выхаванне школьнікаў у сям'і. Асаблівы клопат праўленцаў — школьны камсамольскі лагер працы і адпачынку «Юнацтва». Кожны год пасля заканчэння дзевятага класа больш 40 юнакоў і дзяўчат жывуць у працоўным лагеры, вырошчваюць калгасу буракі, займаюцца ў гуртках, выступаюць з канцэртамі ў брыгадах, ездзяць на экскурсіі. На ўтрыманне лагера калгас штогод выдзяляе па дзве-тры тысячы рублёў. Лагерная вучнёўская вытворчая брыгада працуе на гаспадарчым разліку, жыццём лагера, размеркаваннем сродкаў кіруе савет брыгады. А сёлета працуе яшчэ і піянерскі лагер, пуцёўкі школьнікам выкупіў калгас.

Не раз, да зацвярджэння агульным сходам, прымалі праўленцы на такіх пасяджэннях новых членаў калгаса. Прынялі некалькі механізатараў. А нядаўна — маладую пару рабочых Віну Брэжневу і Леаніда Нехарошава. Мусіць, не захацелася ім больш вандраваць па зямлі, захацелася асесці, пусціць карэнні. Калгас «Савецкая Беларусь» ім асабліва спадабаўся. Ніна пайшла даяркай на ферму, Леанід — у будаўнічую брыгаду. Праз год ім паабяцалі даць кватэру ў новым доме.

Адно з такіх пашыраных пасяджэнняў у лютым было падобна на сход у архітэктурнай майстэрні. У кабінеце старшыні былі расстаўлены макет новага пасёлка, планшэты з праектамі новых будынкаў.

Спачатку падвялі вынікі зробленага за мінулыя тры з паловай гады. Потым абмяркоўвалі прадстаўленыя «Белгіпрасельбудам» праекты новых будынкаў. Адзін за адным уставалі члены праўлення, выказвалі сваю думку па новых праектах. Выгляд гандлёвага цэнтра і дзіцячай музычнай школы на 150 чалавек спадабаўся ўсім — сучасна, прыгожа. У гандлёвым цэнтры (начнуць будаваць яго ўвосень) размесяцяцца не толькі прадуктовы і прамтаварны магазіны, але і кравецкая майстэрня, майстэрня па рамонце электраприбораў, кафэ і рэстаран, цырульня і гасцініца.

За музычнай школай будзе збудаваны мемарыяльны комплекс. Ля высокага кургана ўсыпхне вечны агонь у памяць аб земляках, тых, хто склаў галаву ў барацьбе з ворагамі Айчыны. Далей, у парку — стадыён з усім комплексам спартыўных збудаванняў і плавальным басейнам. Стадыён будзе мець дарожкі для бегуноў, пакрытыя асобым відам бітуму. Стадыёнаў з такім пакрыццем дарожак яшчэ мала ў Саюзе. Праўленне калгаса пасылала ўжо фізорга Віктара Галіпада ў Днепрапятроўск, каб выведаць усё дасканала, як будуюцца такія стадыёны.

Людзі не бясплённа марылі. Яны намячалі новыя канкрэтныя крокі ў будучыню...

17 ЧЭРВЕНЯ 1966 года «Літаратура і мастацтва» змясціла старонку «Калгасная пяцігодка культуры і быту». У ёй расказвалася, як калгаснікі сельгасарцелі «Савецкая Беларусь» уяўляюць свой пяцігадовы план культурна-бытавога будаўніцтва.

Зараз, калі параўноўваеш тое, аб чым пісалася, з тым, што ўжо ёсць, бачыш, як многа і напружана папрацавалі людзі.

Ведаем: наш цяперашні расказ — не поўны. Цяжка ахапіць усё шматграннае і кіпучае культурнае жыццё дванаццаці калгасных вёсак, не паддаюцца апісанню тыя змены ў духоўным вобліку колішняга забітага селяніна заходнебеларускай вёскі.

У Туміне, Вярхах, Мыкішыцах, Ляску, Бардзёўцы ёсць ужо свае брыгадныя клубы. А будуць будавацца і новыя клубы, і чырвоныя куткі, і лазні, і дзіцячыя сады-яслі. Без гэтага ніхто ўжо не ўяўляе вясковага жыцця. Будуць і надалей пракладвацца дарогі. Летась, напрыклад, кіламетровы шлях злучыў Расну з вёскай Тумін.

Непазнавальныя змены прыходзяць у цяперашнюю вёску кожны дзень, кожную гадзіну. Набіраюцца сілы для новага імклівага ўзлёту...

Маладзее зямля пад мірным небам...

П. МІСЬКО,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».
Камянецкі раён.

Кінаапаратная Палаца культуры падобна на дзівосную лабараторыю. Фільм дэманструе кінамеханік-электрык палаца Уладзімір Кірылюк.



У музычнай школе. Заняткі па класу акардэона вядзе заслужаны дзеяч культуры БССР М. Солапаў.

Фота Я. МАКАРЧУКА і М. МІНКОВІЧА.

© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

НАРОД ПАМЯТАЕ

АДКРЫЦЦЁ МЕМАРЫЯЛЬНАЙ ЗАЛЫ В. І. КАЗЛОВА У БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ МУЗЕІ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ



Пазаўчора ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адкрылася мемарыяльная зала, прысвечаная слаўнаму сыну беларускага народа Васілю Іванавічу Казлову.

На адкрыцці мемарыяльнай залы сабраліся прадстаўнікі партыйных, савецкіх і камсамольскіх арганізацый, родныя, сябры і таварышы В. І. Казлова, воіны Савецкай Арміі, пісьменнікі, мастакі, вучоныя, былыя партызаны Мінскага злучэння, якім у гады Вялікай Айчыннай вайны камандаваў В. І. Казлоў.

Экспанаты залы адлюстроўваюць вялікі і слаўны жыццёвы шлях В. І. Казлова — рабочага, партызанскага генерала, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета рэспублікі. Мы бачым Васіля Іванавіча разам з першым касманаўтам Юрыем Гагарыным, з віднымі партыйнымі і дзяржаўнымі дзеячамі, на фабрыках і заводах, у школах, сярод былых партызан.

Аб вялікай усенароднай павазе і любві расказвае стэнд падарункаў В. І. Казлову. Яны — ад працоўных Гомельшчыны, ад салігорскіх шахцёраў, ад мінскіх аўтазаводцаў, ад народных умельцаў братняй Польшчы, ад рабочых сацыялістычнай Чэхаславакіі. Сярод іншых экспанатаў — даравальная фатаграфія народнага артыста СССР У. Уладамірскага і яго навагодняе віншаванне Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, шчыраму другу работнікаў мастацтваў — Васілю Іванавічу Казлову.

За шкляной вітрынай — кніга партызанскага камандзіра «Людзі асобага складу», выдадзеная на беларускай, рускай, польскай, чэшскай і іншых мовах.

Адкрыццё мемарыяльнай залы В. І. Казлова прысвечана надыходзячаму 25-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

І. СУЧКОЎ.

Фота Ул. КРУКА.

У МАЙСТЭРНЯХ Мастакоў

ШТО МОЖА АКВАРЭЛЬ...

У ВІЦЕБСКАГА мастака Фелікса Гумена няма сваёй асобнай майстэрні. Ён працуе або са студэнтамі пединстытута, дзе выкладае, або дома. І на эцюды выязджае часцей са студэнтамі. Вучыць другіх і вучыцца сам. Яго жонка — Ала Гумен — таксама мастачка і таксама выкладчыца Віцебскага педагагічнага інстытута. Ну, і яшчэ, калі ўжо гаварыць пра творчую вучобу Фелікса Гумена, трэба сказаць пра яго сустрэчы з вядучымі акварэлістамі нашай рэспублікі і рэспублік Прыбалтыкі. Ён часта ездзіць да сваіх прыбалтыйскіх калег, працуе з імі ў творчых семінарах. І яны прыязджаюць у Віцебск для абмену творчым вопытам, бо ў Віцебску, апрача Фелікса Гумена, працуюць такія таленавітыя акварэлісты, як І. Бароўскі, Г. Шутаў, В. Ральцэвіч і іншыя.

У Віцебску, у пединстытуце, я глядзеў работы вучняў Фелікса Гумена. Акварэлі. Узрадаваў падыход студэнтаў да гэтай старадаўняй высакародная тэхнікі выяўленчага мастацтва. Кожны студэнт працуе па-свойму. І ў той жа час ёсць нешта агульнае ў гэтых такіх розных па пошуках уласнага «голасу» работах. Гэта агульнае — сур'ёзнасць падыходу да работы, сур'ёзнасць нават у лістах, пакуль яшчэ недасканалых, сапраўды вучнёўскіх.

Гаворачы пра сваіх вучняў, Фелікс Гумен хвалюецца, перажывае іх удачы і няўдачы. А пра свае работы гаворыць куды больш стрымана... Праўда, калі гаворка заходзіць аб правамернасці ўжывання ў акварэлі таго ці іншага прыёму, — «абараняецца» горача, апелюе да вопыту лепшых акварэлістаў мінулага і сучаснасці.

— Мы забылі сёння многія акварэльныя прыёмы, якія ў свой час выкарыстоўваліся шырока. Мы недастаткова вывучаем вопыт папярэднікаў. Нярэдка, як догму, паўтараем, што акварэль мусіць быць толькі празрыстай. Маўляў, «годнасць» паперы таго патрабуе. Але ў выяўленчым мастацтве трэба скарыстоўваць нават самыя нечаканыя магчымасці любога матэрыялу...

Нельга не пагадзіцца з мастаком, тым больш, што свае думкі ён пацвярджае сотнямі акварэльных лістоў, многія з якіх — эксперыментальныя: у акварэльных работах і фарбы і папера могуць даваць эфекты, пра якія мы зазвычай не прывыклі думаць як пра акварэльныя. Фарба можа быць пакладзена густа. Папера можа быць скарыстана не толькі як яшчэ адзін дадатковы тон, але і як фактура. Можна пісаць акварэлі і на таршоне, і на шпалерах (усё залежыць ад пастаўленай перад сабой творчай задачы). Можна пісаць акварэлі нават на палатне. Можна — на тэніраванай паперы. І якое непаўторнае жыццё фактур у кожнай з такіх работ!.. Смела можна сказаць, што многіх эфектаў, даступных шчыльнаму акварэльнаму пісьму (роўна як і празрыстаму), маслам не дасягнеш. А колькі прыёмаў, звязаных з рознымі спосабамі работы — па вільготнай паперы, па сухой, з дапамогаю губкі і без яе, нават са скарыстаннем брытвеннага лязва. Колькі магчымасцей даюць змыўкі і розныя іншыя прыёмы.

Усе гэтыя «лабараторныя» пошукі падпарадкаваны адной мэце — авалодаць фарбамі і настроямі жыцця, фарбамі і настроямі роднай прыроды, «экзотыкі» поўдня і поўначы, прыгажосцю старой і новай архітэктуры, навучыцца перадаваць найтанчэйшыя адценні пачуцця персанажаў, сакавітае буйства фарбаў у нацюрморце. А нацюрморты Фелікс Гумен любіць пісаць. Менавіта ў нацюрмортах адточваецца майстэрства, ставяцца галаваломныя вопыты, каб дасягнуць, як кажуць, узроўню «школы вышэйшага пілатажу» ў акварэлі.

Мы добра ведаем па выстаўках работы Фелікса Гумена, прысвечаныя новабудоўлям Полацка і старому і сённяшняму Віцебску, помнікам архітэктуры Прыбалтыкі і маляўнічай беларускай прыродзе.

І калі бачыш сотні і сотні лістоў, створаных «паралельна»,—разумееш, як настойліва, як мэтанакіравана ішоў Фелікс Гумен да поспеху.

— Вельмі многае дала вучоба ў такіх майстроў акварэлі, як Сяргей Герасімаў, эстонец Аляксандр Пілар (жыве і працуе ў Севастопалі), Ігнас Будрыс з Вільнюса, рыжане Лайман Купцыс і Альгерд Урбаніс... З многімі з іх даводзілася працаваць разам у семінарах акварэлістаў на Чарнігаўшчыне, на Волзе, у Прыбалтыцы, — расказвае Фелікс.

Быў пэўны перыяд, калі наведвальнікі выставак пачалі заўважаць, што ў творчасці мастака з'явіліся паўтарэнні, што паасобныя прыёмы былі на грані штампу. Але мастак здолеў перамагчы гэтае таптанне на месцы і паспхова рушыў далей.

Знаёмячыся з работамі, якія ён мяркуе паказаць на выстаўках, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна (гэта пераважна пейзажныя работы — ленінскія мясціны і Беларусь), пераконваюся, што ў рабоце мастака — новыя зрухі.

Акварэлі, прысвечаныя ленінскім мясцінам, новыя краявіды Віцебшчыны, новыя нацюрморты шмат у чым адрозніваюцца, напрыклад, ад леташніх і нават ад работ, паказаных на другой рэспубліканскай выстаўцы акварэлі. І не толькі новымі акварэльнымі прыёмамі або пераасэнсаваннем старых. Яны адрозніваюцца настроем, матывамі, зместам, адносінамі мастака да матыву. Калі ў яго работах двух-трохгадовай даўнасці на першы план выходзіла проста адлюстраванне таго ці іншага канкрэтнага матыву, калі задачы абмяжоўваліся пераважна імкненнем перадаць і пераасэнсаваць тыя ці іншыя фарбы і матывы, дык цяпер Фелікс Гумен ставіць перад сабою больш сур'ёзныя праблемы. І гэта ярка выяўляецца ў эпічнасці многіх яго пейзажаў, у выразна акрэсленых аўтарскіх адносінах да таго ці іншага матыву.

Роздум над сутнасцю таго, што адлюстроўваецца, дапамог пазбыцца кампазіцыйнай аднастайнасці. Адсюль і большая ўвага да кампазіцыйных і пластычных пошукаў, падпарадкаваных пошукам зместу.

Можна ўпэўнена сказаць, што ў Фелікса Гумена ўсё часцей з'яўляюцца не проста гарадскія ці сельскія пейзажы, не проста нацюрморты ці партрэты, а своеасаблівыя «акварэльныя апавяданні» пра той ці іншы стан чалавечай душы, душы мастака.

Акварэлістам задуманы вялікія серыі акварэльных лістоў. Многія пачаты. Гэтыя серыі — у рэчышчы асноўных тэматычных пошукаў мастака: прыгажосць роднай прыроды і яднанне з ёю душы чалавечай, веліч створанага на зямлі і прыгажосць унутранага свету нашага сучасніка.

Ул. БОЙКА.

Віцебск—Мінск.

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.]

ну з прычын таго, што героі многіх апавяданняў выглядаюць духоўна збедненымі, ён бачыць у тым, што часам самім пісьменнікам бракуе псіхалагічнай культуры, каб спасцігнуць усю глыбіню душы свайго героя, усё духоўнае багацце савецкага чалавека.

Далей прамоўца пагаджаецца з тымі ўдзельнікамі дыскусіі, якія з трывогай гаварылі аб дробязнасці думкі і зместу многіх сучасных апавяданняў. Як прыклад такога малазмястоўнага твора ён называе апавяданне Я. Васілёнка «Горкая радасць», змешчанае ў апошнім нумары часопіса «Полымя» за гэты год.

— Відаць, усе вялікія беды нашых апавяданняў, — адзначае І. Мележ, — вынікаюць з таго, што асобныя нашы празаікі ўсё ж слаба ведаюць жыццё. Адсюль і выдуманыя героі, і дробязныя калізіі, і бяздумныя апісанні, і недастаткоае філасофскае асэнсаванне герояў і іх учынкаў.

У сувязі з гэтым прамоўца гаворыць аб тым, што спрэчкі ў дыскусіі часта насілі чыста прафесійны характар, што ў дыскусійных артыкулах амаль не разглядалася пытанне ўзаемадзеяння літаратуры і жыцця, героя ў жыцці і ў літаратуры, што літаратурныя праблемы не правяраліся, не падмацоўваліся праблемамі жыцця, канкрэтнымі жыццёвымі фактамі і падзеямі.

— Мне ў гэтых адносінах, — заўважае прамоўца, — спадабаліся асобныя палажэнні артыкулаў І. Навуменкі і А. Яскевіча, спадабаліся тым, што ў іх былі спробы правяраць літаратуру, у прыватнасці, наша апавяданне, жыццём. І. Навуменка, напрыклад, правільна гаварыў, што ў апошні час у жыцці нашага народа адбыліся велізарныя змены. Наша літаратура амаль прайшла міма такой важнай з'явы, як працэс урбанізацыі. Многія жыхары вёскі сталі рабочымі заводаў і фабрык. Узніклі новыя канфлікты і супярэчнасці, якіх раней не ведала наша літаратура. І шкада, што мы праходзім міма гэтых складаных працэсаў, якія датычацца псіхалогіі, жыццёвага ўкладу нашага народа. У гэтым сэнсе мне вельмі спадабалася апавяданне В. Адамчыка «Хата», у якім чуйна ўлоўлены ход гэтага працэсу, які адбываецца на нашых вачах і закранае дзесяткі тысяч нашых сучаснікаў.

Далей І. Мележ гаворыць аб тым, што наша апавяданне застаецца пакуль што тэматычна абмежаваным, што яно нясмела кранаецца сфер гарадскога жыцця, што ў ім вельмі мала спроб гаворкі пра барацьбу прагрэсіўнага чалавецтва супраць вайны, пра сучаснае армейскае жыццё.

У канцы свайго выступлення прамоўца спыняецца на месцы апавядання сярод іншых жанраў прозы.

— Удзельнікі дыскусіі правільна адзначалі, — гаворыць І. Мележ, — што апавяданне— аператыўны, чуйны да змен і павеваў жыцця жанр. Сапраўды, апавяданне павінна быць такім, яно не патрабуе такіх вялікіх накапленняў, як, напрыклад, раман. Тым не менш, мы павінны прызнаць, што жанр апавядання мы выкарыстоўваем пакуль што недастаткова аператыўна, што наша апавяданне занадта інертнае ў асваенні сучаснага жыцця, што яно маладзейшае, глухое да новых канфліктаў і супярэчнасцей.

Янка Скрыган у сваім выступленні засяродзіўся на ўпушчэннях і праліках, якія, на яго думку, былі ўласцівы дыскусійнай гаворцы ў газеце «Літаратура і мастацтва».

Адзначыўшы напачатку, што дыскусія пра апавяданне ўвогуле праводзіцца са спазненнем, што было б лепш, калі б яна праводзілася гады два назад, калі, бышам, быў час самай апавядальнай актыўнасці, Я. Скрыган гаворыць, што і пачынальнік размовы на старонках газеты, і іншыя таварышы, якія прымалі ўдзел у гаворцы, спрабавалі рабіць азначэнні жанру апавядання, аднак яны забываліся на спецыфіку жанру, калі пераходзілі да канкрэтнай гаворкі пра тыя ці іншыя творы. Тады іх разважанні зводзіліся толькі да таго, каб падмацаваць пэўныя, загадзя вызначаныя схемы і тэзісы.

— Крытыкі загадзя распрацавалі сабе схемы, да якіх і пачалі прымяраць: падыходзіць ці не падыходзіць да іх тое ці іншае апавяданне, — гаворыць Я. Скрыган. — Яны пайшлі па шляху ілюстратарства: назавуць свой тэзіс, — дапусцім, інфляцыя апавядання або адсутнасць маштабнага героя, — і гэты тэзіс ілюструюць прозвішчамі пісьменнікаў і назвамі твораў.

Прамоўца гаворыць далей аб тым, што, на яго думку, многія дыскусійныя артыкулы мелі абстрактны, адцягнены характар, што яны былі далёкія ад рэальнага становішча спраў.

— Што такое маштабны герой?—пытаецца Я. Скрыган.— Як спалучыць гэтае азначэнне з жывым чалавекам? Чаму трэба браць не глыбіню, а маштаб? Па-праўдзе, мне не зусім зразумелыя вось такія абстрактныя тэзісы, у захвяру якім прыносіцца творчасць. Чаму было не ўзяць жывыя творы, чаму было не прайсціся па іх пільным вокам, праверыць, з чаго і як яны зроблены, якую ставяць мэту, чым вабяць вас або чым не адпавядаюць праўдзе мастацтва,— і тады было б відно, дасягнуў пісьменнік мэты ці не дасягнуў. А з сумы такіх аналізаў было б відно і тое, чым і на якім этапе займалася апавяданне, чым яно займаецца сёння, што няце з сабою. Менавіта вось такога канкрэтнага аналізу і бракавала многім артыкулам удзельнікаў дыскусіі.

— Самым удалым артыкулам з усёй дыскусіі, — працягвае Я. Скрыган, — я лічу артыкул Васіля Бурана. На парадак абмеркавання ён паставіў усё такі нямала пытанняў, сфармуляваў пэўныя палажэнні, якія давалі падставы для гаворкі. І шкада, што больш ніхто не паглыбіўся ў сутнасць справы, што ўся далейшая размова набыла дробны, выпадковы характар, паказаўшы непадрыхтаванасць крытычнай думкі да такой важнай з'явы, як мастацкі аналіз, прытым аналіз не толькі формы, а ўсёй ідэйна-мастацкай сукупнасці твора.

Адзначыўшы далей, што дыскусія пра апавяданне праводзіцца ў нас упершыню, прамоўца выказвае шкадаванне з прычыны таго, што ў ёй не відно было нашага апавядання ў часе, не відно было таго шляху, які прайшоў жанр апавядання ў сваім развіцці, што ў дыскусіі нельга было знайсці адказаў на такія важныя пытанні, як: адкуль і з чаго пачалося ў нас апавяданне, якія яно мела этапы развіцця, што было характэрна для кожнага з гэтых этапаў, якія былі яго пошукі, да чаго яны прыводзілі, чым адрозніваецца, напрыклад, маладнякоўскае апавяданне ад нашаніўскага, па якім шляху пайшлі пазнейшыя апавядальнікі, ці мела і ці мае наша апавяданне нейкія нацыянальныя асаблівасці, у якіх яно суадносінах з апавяданнем суседніх братніх рэспублік, з рускім апавяданнем і г. д.

— Калі б такая работа была зроблена, — падкрэслівае Я. Скрыган, — тады не было б падстаў гаварыць аб інфляцыі малога жанру нашай прозы, тады б мы ўбачылі нейкую заканамернасць у яго развіцці, тады можна было б па-сапраўднаму разабрацца ў прычынах яго росту ці заняпаду.

Прамоўца адзначае таксама тое, што, на яго думку, гаворка ў дыскусіі была зведзена да гаворкі аб творчасці вузкага кола апавядальнікаў, у прыватнасці, аб творчасці маладых празаікаў, што ў ёй нават не ўпаміналіся такія празаікі, як Мікола Лупсякоў, Аркадзь Чарнышэвіч, Іван Мележ, Іван Шамякін і многія іншыя пісьменнікі старэйшага і сярэдняга пакалення.

Сур'ёзны папрок робіць прамоўца ў адрас удзельнікаў дыскусіі і за тое, што яны не павялі размовы пра стыль, почырк, інтанацыю, вобраз, паэзію, дэталь, пейзаж і іншыя кампаненты мастацкага твора, пры дапамозе якіх да чытача даносіцца яго змест, ідэя, сутнасць.

Заканчваючы сваё выступленне, Я. Скрыган гаворыць:

— Нягледзячы на тое, што тон дыскусіі на старонках газеты быў «безнадзейны», я ўсё ж не веру ў нейкі спад ці заняпад жанру апавядання. Калі ў нас цяпер ёсць нейкі пэўны зацішак, дык я гляджу на гэта як на заканамернасць. Я думаю, што з'ява гэтая натуральная, бо ў пісьменніцкай дзейнасці патрэбны нейкія хвіліны, паўзы для роздуму, для пераўзбраення. Упэўнены, што ў кожнага гэта бывае, калі напісанае не зусім задавальняе цябе, калі хочацца напісаць лепш. А пісаць лепш — не так лёгка. Можа быць, так і трэба старацца пісаць: не шмат, а добра, іменна добра, з усімі якасцямі, якія вынікаюць з гэтага слова.

Некаторымі думкамі, развагамі ў сувязі з гаворкай пра сучасны стан нашага апавядання падзяліўся Аляксей Кулакоўскі. На яго погляд, дыскусія прынесла, нягледзячы на ўсе свае недахопы, пэўны плён. Яна прымусіла многіх задумацца над станам нашай навелістыкі, над яе поспехамі і няўдачамі, прымусіла больш крытычна і патрабавальна паставіцца да творчасці сваіх таварышаў і да сваёй уласнай.

У гаворцы, працягвае А. Кулакоўскі, было закранута нямала надзённых і важных праблем, якія непазбежна паўстаюць перад кожным апавядальнікам. Такой важнай і надзённай праблемай, на думку прамоўцы, з'яўляецца праблема духоўнага напаўнення герояў твораў, аб чым гаварыў у сваім артыкуле В. Каваленка. Сапраўды, падкрэслівае А. Кулакоўскі, трэба імкнуцца да таго, каб герой нашай літаратуры, няхай сабе гэта будзе звычайны, просты, як кажуць, чалавек, паўставаў ва ўсёй духоўнай велічы і багацці.

Спасылаючыся на свой творчы вопыт, а таксама на вопыт сваіх калег-равеснікаў, прамоўца гаворыць аб тым, што нават у неспрыяльны час, у сараказвыя гады і ў пачатку пяцідзесятых, у апавяданнях быў, на яго думку, моцны зарад сацыяльнага, грамадзянскага пафасу, хоць, магчыма, апавяданні тыя былі не зусім беззаганныя ў мастацкіх адносінах. А вось творчасці сённяшніх маладых празаікаў, нягледзячы на ўсю іх таленавітасць, часта не хапае гэтага сацыяльнага пафасу.

— Мне здаецца, — гаворыць А. Кулакоўскі, — што ў іх творах часам пафас агульначалавечы выцясняе пафас сацыяльны. Такое прыглушанае грамадзянскае гучанне, напрыклад, я заўважаў у некаторых творах таленавітага маладога празаіка А. Кудраўца, пра якога асабліва шмат гаварылі ўдзельнікі дыскусіі.

У сувязі з гэтым прамоўца гаворыць аб тым, што крытыка наша часам траціць меру і задужа шчодра раздае пахвалы і камплімэнты літаратурнай моладзі — замест таго, каб даць спакойную і цвярозую ацэнку зробленага ёю. Гэта, заўважае А. Кулакоўскі, можа толькі пашкодзіць далейшаму творчаму росту некаторых маладых. З другога ж боку, на думку прамоўцы, крытыка часам абыходзіць маўчаннем многіх пісьменнікаў старэйшага пакалення, якія нямала зрабілі ў літаратуры.

Заўвагі ў адрас удзельнікаў дыскусіі, выказаныя Я. Скрыганом, падтрымаў Алесь Асіпенка.

— Сапраўды, — гаворыць ён, — часам цяжка было зразумець, аб чым жа канкрэтна ідзе размова: ці ўвогуле пра беларускае апавяданне, ці пра апавяданне сённяшняга дня, ці толькі пра апавяданні маладых. Размова, па-сутнасці, вялася пра апавяданні мінулага года. Але ж гэта занадта малы тэрмін, каб

ЖАНРУ АПАВЯДАННЯ— УВАГУ І ПАДТРЫМКУ

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

вай модай. Модай таму, што за гэтай бышам і ўвагай няма глыбіні, няма шырыні погляду на жыццё ўвогуле. А без гэтай шырыні пісьменніцкага погляду на жыццё і людзей так званы просты чалавек ператвараецца ў творы ў прастакаватага чалавека.

— Задача нашай літаратуры, у тым ліку і навелістыкі, — падкрэслівае ў заключэнне В. Адамчык, — паказаць нашага чалавека ўсебакова, ва ўсёй яго духоўнай, маральнай велічы. Мы пакуль што гэтага не зрабілі.

Выступае Васіль Буран.

— Шчыра кажучы, — гаворыць ён, — калі пачыналася дыскусія, я не думаў, што яна пройдзе так вяла. Чакалася, што яна ўскалыхне пісьменніцкую грамадскасць, што яна выкліча шырокую і прынцыповую гаворку. На жаль, гэтага не здарылася. Кожны ўдзельнік дыскусіі быццам і закранаў нейкія пытанні, але не вельмі прытрымліваўся галоўнага, не вельмі прыслухоўваўся да думак сваіх папярэднікаў. У выніку ў дыскусіі не знайшлі асвятлення такія праблемы, як праблема характару ў апавяданні, праблема грамадзянскасці літаратуры, праблема майстэрства і г. д.

Адной з прычын вяласці гаворкі прамоўца лічыць адсутнасць у пісьменніцкім асяроддзі сапраўды творчай атмасферы— той атмасферы, якая прадвызначае глыбокую зацікаўленасць у падтрымцы ўсяго таленавітага, самабытнага і разам з тым непрымірымасць да літаратурнага сурагату, атмасферы, якая прадвызначае гатоўнасць выслухаць і абмеркаваць любую думку, калі яна толькі варта ўвагі.

— Аднак пры ўсіх сваіх недахопах, — зазначае В. Буран, — праведзеная дыскусія ўсё ж у нечым і павучальная. Павучальная хоць бы сваімі недахопамі. Напрыклад, усім стала ясна, што толькі нежаданнем «абвастраць адносіны» можна вытлумачыць той сумны факт, што пісьменнікі-апавядальнікі, за выключэннем аднаго І. Навуменкі, так і не прынялі ўдзелу ў дыскусіі. А між тым гаварыць было пра што. Факт застаецца фактам: сённяшняе беларускае апавяданне неяк здрабнела, страціла сваю ранейшую вастрыню. Што гэта так, пагаджаліся амаль усе ўдзельнікі абмеркавання.

Далей прамоўца спрачаецца з некаторымі сваімі апанентамі, у прыватнасці, з А. Яскевічам і І. Навуменкам, якія, на думку В. Бурана, у запале спрэчкі надавалі яго выказванням і заўвагам іншы сэнс, тлумачылі іх паза кантэкстам.

Апошнім на пасяджэнні выступіў Янка Брыль. Дыскусія, гаворыць ён, яшчэ раз паказала, што да жанру апавядання і да саміх апавядальнікаў у нас паранейшаму абыякавыя, а то нават і пагардлівыя адносіны. Пісьменнік - апавядальнік, які не напісаў рамана ці аповесці, лічыцца як быццам нейкім «падмастерьем».

Закранаючы праблему герояў апавядання, праблему «вялікага» і «маленькага» чалавека, пра што спрачаліся многія ўдзельнікі дыскусіі, прамоўца гаворыць:

— Гаворка тут, мне думаецца, павінна весціся не толькі ў чыста літаратурным аспекце. Давайце зірнем на гэтую праблему з іншага боку. За кожным апавяданнем Антона Паўлавіча Чэхава перш за ўсё бачыцца высакародны, разумны і вельмі добры чалавек. Можна нагадаць і іншых майстроў, у якіх вучымся і мы, і будуць вучыцца нашы наступнікі. Успомнім Льва Мікалаевіча Талстога. Ён браў любую кнігу ў рукі з пытаннем, звернутым да яе аўтара: хто ты такі, што ты за чалавек і што маеш сказаць мне. Дык вось, калі гаварыць пра тое, што здрабнела наша апавяданне, дык перш за ўсё трэба сказаць пра тое, што, відаць, мы самі здрабнелі ў сваіх думках і пачуццях, сталі баязлівымі і не заўсёды апраўдваем сваё высокае званне.

Нам трэба добра бачыць розніцу паміж творчасцю і рамеснічтвам, працягвае прамоўца. Можна пайсці да рамесніка, год павучыцца і навучыцца шыць боты, і шыць іх усё жыццё, стаць добрым рамеснікам. Іншая справа—творчасць. Калі ў пісьменніка няма бесперапыннага пошуку тэмы, пошуку форм, калі ў пісьменніка няма свайго стаўлення да рэчаіснасці, яму пагражае небяспека стаць рамеснікам.

— Таму,—гаворыць Я. Брыль, —не трэба спяшацца, не трэба дакараць каго-небудзь з нашых таварышаў, што ён часова замоўк. Успомнім Твардоўскага, які гаварыў, што гэта страшна вялікая несправядлівасць — дакараць пісьменніка за маўчанне. Гэтае маўчанне з'яўляецца найбольшай трагедыяй для таго, хто маўчыць, калі ён сапраўдны мастак. Трэба навучыцца паважаць адзін аднаго і чакаць прыемных нечаканасцей ад таварыша, які маўчыць нейкі час. Я мог бы назваць прозвішчы многіх, у адносінах да якіх наша чаканне і вера апраўдаліся. Іншыя нашы чаканні яшчэ спраўдзяцца. Я асабіста аддаю перавагу захапленню, чым недаверу. Дай бог нам памыляцца больш тады, калі мы гаворым добра адзін пра аднаго, чым дрэнна!

Прамоўца пагаджаецца з Я. Скрыганом у тым, у прыватнасці, што дыскусія аб сучасным стане апавядання магла б мець больш навуковы характар, што наша крытычная і літаратуразнаўчая думка сёння сталася і ёй пад сілу сур'ёзныя задачы, што, сапраўды, можна і трэба было б глянуць на наша апавяданне шырэй, у параўнанні з рускім і сусветным апавяданнем.

У заключэнне Я. Брыль гаворыць аб месцы жанру апавядання сярод іншых жанраў прозы, падкрэслівае, што апавяданне, поруч з маленькай аповесцю, з'яўляецца найбольш сучасным жанрам літаратуры, што ацэнка і ўвага да яго павінны вызначацца не памерам, а мастацкай якасцю.

Паэтычная ПАВЕРКА

Юрась СВІРКА

З КНІГІ «КРЭЎНАСЦЬ»

ПЕРАСЯЛЕННЕ

Хадзіў па лесе, слухаў цішыню,
Быў дзень такі задушлівы, гарачы.
Узгорак мне прыўзняў далечыню,
І я дзялянку светлую убачыў.

Тут бор шумеў.
Цяпер тут ціха так,
Аж крышыцца сасновая ігліца.
Мурашкі перацягваюць сушняк—
Прыходзіцца адсюль перасяліцца.

Паўзуць яны—чырвоныя значкі—
Туды,
Дзе елкі выпрамляюць хібы.
Лясной крыві жывыя ручайкі
Бягуць з гары на новую сялібу.

КАРЭННЕ

Калі сасна ляцела да імхоў,
Калі яна,
На мяккі мох упала —
Не шкадавала зломленых сукоў,
Сваё карэнне толькі шкадавала.

Яно ў зямлю глыбока ўвайшло,
Каб гнаць жывіцу:
Кроў сваю і сілу.
І будзе верыць,
Што залье смалой
Надрэз,
Каб сучча з ветрам гаманіла.

Не чуць яму,
Як ціха угары.
Не знаць,
Чаму вершаліна не гнецца...
І не пачуць нікому у бары,
Калі ў пяску карэнне задыхнецца...

КАЛІ З ЛАПАТАЮ СТАІШ

Зундзяць у ліпах недзе восы.
Антонаўкай навошчан дзень.
Саджаю яблынькі я ўвосень,
І так стаю,
Каб нават цень,
Мой цень не ціснуў на карэнне.
У ямкі ссоўваю зямлю.
Якое светлае імгненне!—
Жывое прыкрываць люблю.

НЯВЫКАЗАНЫЯ ЗДАГАДКІ МАЁЙ ДАЧУШКІ

Пасцелька мякчэйшая—
Мамчыны рукі.

Зоркі ярчэйшыя —
Мамчыны вочы.

Сонца святлейшае—
Мамчына ўсмешка.

Песня найлепшая—
Мамчына калыханка.

Няўжо гэта ўсё забываецца!..

ЗВАРОТ

Паэты!
Вы усе паслы народа
У краіне праўды і свабоды.

А народ чакае ад паслоў
Самых верных і праўдзівых слоў.

Апраўдайце ж місію паслову—
Праўду выпраменьвайце па слову.

Пагрэі Фядзь Навіны

ВЯЛІКАМУ СЫНУ ДАНІІ

Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі і Саюз пісьменнікаў БССР правялі ўрачысты вечар, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння выдатнага дацкага пісьменніка Марціна Андэрсена Нексе.

Вечар адкрыў каротким уступным словам акадэмік-сакратар аддзялення грамадскіх навук Акадэміі навук БССР, акадэмік АН БССР паэт Пятро Глебка. З дакладам аб жыцці і творчай дзейнасці Марціна Андэрсена Нексе выступіў загадчык кафедры зарубежнай літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта Б. Міцкевіч.

ДАЎГАЛЕЦЦЕ СПЕКТАКЛЯЎ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДРАМАТУРГІІ

У рэпертуары Рэспубліканскага тэатра юнага гледача ёсць нямала спектакляў, пастаўленых па творах беларускіх драматургаў. Некаторыя з іх вытрымалі выпрабаванне гледача і многа год ідуць на сцэне тэатра з нязменным поспехам.

Своеасаблівы юбілей у спектакля па драме Івана Шамякіна «Не верце цішыні», пастаўлены напярэдзесяці год назад В. Пацехіным. 1-га ліпеня ў Іванаве на сцэне рабочага Дома культуры, дзе зараз гастралюе тэатр, спектакль будзе паказвацца пяцісоты раз.

У гэты дзень пяцісоты раз выйдзе на сцэну артыст тэатра Барыс Пісунч, які выконвае ролю сакратара камсамольскай арганізацыі калгаса Кандрата Будзя. Тры ролі іграў у спектаклі артыст Георгій Ручымскі — маёра дзяржбяспекі Сухавея, шпіёна і старога Ягора Будзя. На юбілейным вечары Г. Ручымскі выступіць у ролі шпіёна. Адна з першых выканаўцаў ролі Евы Васільеўны актрыса Ксенія Каралёва таксама прыме ўдзел у спектаклі.

У творчым жыцці тэатра адбылася яшчэ адна важная падзея. 21 чэрвеня ў клубе саўгаса «Дзісненскі» Міёрскага раёна быў паказаны трохсоты спектакль па п'есе Івана Козела «Над хвалямі Серабранкі», пастаўлены Л. Мазалеўскай. У спектаклях нязменна Удзельнічаюць заслужаны артыст рэспублікі Уладзімір Говар-Бандарэнка (Язэп), артысты Апалінарыя Ротар (Ярына) і Барыс Барысёнак (Васіль).

Загадам дырэкцыі тэатра артыстам — старэйшым удзельнікам гэтых спектакляў — аб'яўлена падзяка.

© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

© PDF: Kamunikat.org 2023

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2023

МІКАЛАЙ РЫЛЕНКАЎ

Савецкая літаратура, уся сям'я савецкіх літаратараў панесла вялікую страту — памёр выдатны рускі паэт, палымяны патрыёт Радзімы, яе натхнёны пясняр Мікалай Іванавіч Рыленкаў.

НАШ НЕЗАБЫЎНЫ ДРУГ

Памёр Мікалай Іванавіч Рыленкаў — выдатны рускі савецкі паэт.

Цяжка пісаць пра смерць нашага добрага друга, цудоўнай душы чалавека. Сорак гадоў усхвалявана гучаў ясны і чысты паэтычны голас Мікалая Рыленкава.

Шчырая любоў да роднай зямлі, да людзей, якія жывуць ля старой смаленскай дарогі, напоўніла дваццаць яго таленавітых кніг. Мікалай Іванавіч жыў у Смаленску, але паэтам ён быў усесаюзнага гучання. У самых далёкіх кутках нашай неабдымнай Радзімы чытаюць і будуць чытаць яго празрыстыя вершы пра непаўторную прыроду рускага Прыдняпроўя, спяваюць песню пра дзяўчынку, якая ходзіць па полі, дзе цвіце блакітны лён.

Заўсёды савецкія людзі, удзячныя чытачы будуць зноў і зноў звяртацца да мудрай філасофскай лірыкі паэта.

Мікалай Іванавіч быў нашым добрым суседам. Беларускія паэты гасцілі ў яго старажытным Смаленску, а Рыленкаў часта наведваў Беларусь, добра ведаў і любіў беларускі народ, яго песні, яго літаратуру.

Мікалай Рыленкаў зрабіў нямала высокамастацкіх перакладаў з нашай паэзіі, і мы яму бясконца за гэта ўдзячны.

Ён прыязджаў да нас не толькі ў дні юбілеяў ці з'ездаў. Паэт часта выступаў у нас на нарадах маладых пісьменнікаў, на семінарах перакладчыкаў, выступаў з чытаннем сваіх твораў у многіх гарадах і вёсках Беларусі. Мікалай Іванавіч актыўна ўдзельнічаў у нашых надзённых справах: і ў Маскве, і ў Мінску ён выступаў у абмеркаваннях беларускіх часопісаў, кніг, праблемных пытанняў.

Яго слова заўсёды было важкае, аўтарытэтнае і горача ўспрымалася слухачамі. У мінулым годзе Вярхоўны Савет БССР узнагародзіў Мікалая Рыленкава Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Мы ніколі не забудзем шматлікія сяброўскія размовы з Мікалаем Іванавічам. Ён многае ведаў, глыбока і нечакана пра многае думаў. Яго заўсёды нешта хвалявала, і жыў паэт у вечным неспакоі.

«Слова аб палку Ігаравым» і лёс старажытных храмаў, праблемы мовы і мастацкага перакладу, справы музеяў і ахова лясоў і азёр, забытыя паэты і новыя таленты—да ўсяго ў Мікалая Іванавіча была непагасная і дзейсная зацікаўленасць.

Ва ўсіх словах і справах Рыленкава ярка праяўляўся цэльны, непаўторны воблік рускага народнага паэта, савецкага патрыёта.

Беларускія пісьменнікі ў жалобе схіляюць сёння галовы над магілай нашага дарагога друга і брата.

Пімен ПАНЧАНКА,
Максім ТАНК.

У ГОРКУЮ ХВІЛІНУ РАЗВІТАННЯ

Няшчасці і страты прыходзяць нечакана.

Савецкая паэзія страціла нястомнага працаўніка, тонкага і шчырага лірыка: у многіх з нас не стала добрага, чулага і ўважлівага друга. Цяжка паверыць і звыкнуцца з думкаю, што болей няма сярод нас Мікалая Рыленкава, што болей не з'явяцца новыя падборкі яго мудрых і пранікнёных вершаў, што болей не сустрэнем гэтага прагнага на ўражанні, падарожжы і сустрэчы вандраўніка.

Зусім нядаўна, нейкія чатыры месяцы назад, усе мы, уся савецкая літаратура, сябры і прыхільнікі Мікалая Рыленкава ўрачыста адзначалі яго юбілей. Мікалай Іванавіч тубыліся, сяброўскі і скептычна ўсміхаўся. Потым неяк сказаў мне: «Не люблю юбілеяў, але нічога не зробіш... сёння асабліва адчуў, як многа яшчэ трэба зрабіць». І ў лістах пісаў: «За работу яшчэ ніяк не вазьмуся. Толькі адказваю на пісьмы. Але, як кажуць, трэба даўгі плаціць». Ён і ў вершах лічыў сябе даўжнікам:

Ты станешь тревогой моею
Стучаться в людские сердца...
А большего я не имею,
Чтоб долг оплатить до конца.

І плаціў свайму народу чыстым золатам паэзіі. Ён жыў паэзіяй і для паэзіі, думаў, клапаціўся пра яе будучае.

Сёлета завірушным лютаўскім днём у гасцінай кватэры Рыленкава сабраліся паэты і крытыкі. Гаварылі пра паэзію, чыталі класікаў і сучаснікаў. На гэтай сустрэчы Мікалай Іванавіч сказаў прыкладна так: паэт на пэўных этапах павінен адчуваць сябе вучнем, пачаткоўцам, нібы ўсё пачынае спачатку, бачыць і адкрывае свет упершыню. Упершыню бярэцца за пяро, піша першы радок, забыўшыся пра свой вопыт, пра свае кнігі. Калі бываюць такія этапы, значыць пашанцавала, значыць, ты сапраўдны паэт.

Рыленкаў быў сапраўдны паэт, заўсёды новы, непасрэдны: нібыта толькі што ўбачыў, здзівіўся і зачараваўся харастваом жыцця, людзей і прыроды.

Нядаўна я напісаў верш, прысвечаны Мікалаю Іванавічу. Чакаў выхаду часопіса, думаў—парадую друга. І раптам званок са Смаленска: «Памёр Мікалай Іванавіч...»

Не верыцца, не хочацца верыць! У памяці ён застанецца заўсёды жывым, натхнёным, уважлівым, добрым.

Шчодрая талентамі смаленская зямля, якую ён так любіў, якой так верыў, дзеля якой жыў, узгадавала і прыняла на вечны спакой слаўнага песняра Мікалая Рыленкава. А песні?.. Тут успомніліся радкі самога Мікалая Іванавіча:

Когда поэт всей силой тщания
Стремиться к новым поколениям,—
Мы верим в горький час прощания,
Что станет смерть вторым рождением.

Нізка схіляюся перад тваім подзвігам, перад тваёю памяццю, дарагі, незабыўны дружа.

Сяргей ГРАХОЎСКІ.

НА УСПАМІН ПРА БЕЛАРУСЬ. Фотаэцюд А. ГЛІНСКАГА.

ПАД АХОВАЙ ДЗЯРЖАВЫ І ГРАМАДСКАСЦІ

Два з лішнім гады назад на Украіне было створана Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Карэспандэнты АДН Усевалад Ведзін і Кіеўскага радыё Яўгенія Івашчанка папрасілі старшыню праўлення таварыства, намесніка Старшыні Савета Міністраў Украінскай ССР Пятра Транько адказаць на рад пытанняў, якія датычаць дзейнасці гэтай арганізацыі.

— Якія прынцыпы ляжаць у аснове дзейнасці таварыства і што зрабіла яно з часу заснавання?

— Перш за ўсё мне хацелася б напомніць аб Дэкрэце аб ахове помнікаў мастацтва і старажытнасці, які падпісаў Ленін у 1918 годзе. Гэта быў цяжкі год—грамадзянская вайна, голад, разруха. І ў такі суровы час Уладзімір Ільіч гаварыў аб неабходнасці прыкласці ўсе намаганні, каб захаваць багатую культурную спадчыну народа для будучых пакаленняў.

Гэтыя ленінскія ўказанні пакладзены ў аснову дзейнасці нашага таварыства. Зараз у ім больш як тры мільёны членаў — рабочых, калгаснікаў, відных вучоных, пісьменнікаў, майстроў сцэны, моладзі, хатніх гаспадынь, пенсіянераў. Таварыства мае арганізацыі ва ўсіх абласных цэнтрах, гарадах і раёнах. Больш як 40 тысяч первічных арганізацый — на буйных прадпрыемствах, у калгасах, навуковых і культурных установах. Яны вядуць вялікую даследчую работу, папулярызуюць існуючыя, выяўляюць невядомыя помнікі. Колькасць узятых на ўлік і перададзеных пад ахову дзяржавы помнікаў у нашай рэспубліцы перавышае зараз 25 тысяч.

— Хто фінансуе таварыства і ў якіх памерах?

— Значныя сродкі для рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры асігнуе дзяржава. У рэспубліцы, асабліва пасля Вялікай Айчыннай вайны, зроблена ў гэтых адносінах нямала. Амаль усе выдатныя помнікі і архітэктурныя ансамблі, разбураныя нямецка-фашысцкімі запохнікамі ў гады вайны (больш 1500 каштоўных архітэктурных збудаванняў і скульптурных помнікаў) адноўлена, рэстаўрыравана і вернута ў культурны фонд краіны.

У пасляваенныя гады на гэта выдаткавана 18 мільёнаў рублёў. Асабліва вялікіх сродкаў патрабавалі аднаўленне і капітальны рамонт славутага Кіева-Пячэрскага запаведніка і рэстаўрацыя аднаго з прыгажэйшых у свеце Адэскага опернага тэатра.

З утварэннем таварыства ўзнікла яшчэ адна крыніца фінансавання—членскія ўзносы і добраахвотныя паступленні ад індывідуальных і калектыўных членаў таварыства, фабрык, калгасаў, школ, асобных грамадзян.

— Ці даводзіцца таварыству яшчэ сутыкацца з неразуменнем асобнымі ведамствамі, асобамі значэння захавання гісторыка-культурных помнікаў?

— Рэдка, але даводзіцца. Іншы раз пры забудове і асабліва пры рэканструкцыі некаторых гарадоў і іншых населеных пунктаў будаўнікі не ўлічваюць гістарычнага значэння і мастацкай каштоўнасці таго ці іншага помніка старажытнасці. Бывае, што няўважлівасць або неахайнасць прыводзяць да сур'ёзных вынікаў. Я маю на ўвазе пажар у канцы лістапада мінулага года ў Георгіеўскай царкве—помніку архітэктуры XVII стагоддзя ў былым Выдубецкім манастыры ў Кіеве. У маі 1967 года было прынята рашэнне аб добраўпарадкаванні помнікаў культуры на тэрыторыі гэтага манастыра. Пачаліся рэстаўрацыйныя работы. Да 1970 года намячалася адкрыць Выдубецкі комплекс для агляду савецкімі і замежнымі турыстамі, і раптам—пажар. Згарэлі драўляныя канструкцыі і пяць купалаў, пакрытых пазалотай, на рэстаўрацыю якіх, дарэчы, у цяжкія пасляваенныя гады дзяржава выдзеліла немалыя сродкі.

— Якія прычыны пажару?

— Урадавая камісія, якая займалася расследаваннем, устанавіла, што пажар узнік у выніку неахайнага карыстання часовымі электраасвятляльнымі прыборамі. Вінаватыя прыцягнуты да строгай адказнасці. Урад прымае меры для аднаўлення Георгіеўскай царквы ў яе першапачатковым выглядзе. Апрача таго, будуць рэстаўраваны — дом мітрапаліта, Брацкі корпус, капліца, званіца, трапезная і іншыя збудаванні.

— Якія перспектывы дзейнасці таварыства, якое вы ўзначальваеце?

— У бліжэйшым будучым—гэта падрыхтоўка да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. Шырока разгорнецца прапаганда ленінскіх ідэй аб выкарыстанні культурнай спадчыны мінулага ў інтарэсах будаўніцтва новага грамадства, у інтарэсах патрыятычнага выхавання народа. Добраўпарадкоўваюцца мемарыяльныя месцы, звязаныя з гісторыяй і культурай украінскага народа, яго рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славай. Прадоўжыцца выяўленне гістарычных і культурных помнікаў Украіны.

Пры таварыстве створаны выдавецкі аддзел, які рыхтуе двухтомную працу «Помнікі гераічнага мінулага ўкраінскага народа». Сёлета пачнём выдаваць часопіс «Помнікі Украіны». А ў планах на будучае—новыя шматтомныя выданні. У абавязкі аддзела ўваходзіць і падрыхтоўка буклетаў, даведнікаў, паштовак, плакатаў. Будуць выпускацца памятныя сувеніры. Зразумела, што прыбыткі ад рэалізацыі ўсёй гэтай прадукцыі пойдуць на рамонт і рэстаўрацыю помнікаў, стварэнне новых музеяў.

Наогул, ўся дзейнасць таварыства падначалена адной мэце—захаваць гісторыка-культурныя помнікі Радзімы для будучых пакаленняў.

У. І. Ленін не раз падкрэсліваў, што новае грамадства можна будзе пабудаваць толькі тады, калі авалодаеш усім духоўным багаццем, створаным чалавецтвам. Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя зберагла для нашчадкаў духоўныя скарбы папярэдніх пакаленняў і ў гэтым яе гуманізм: чалавек павінен быць патрыётам сваёй краіны. Кожны абавязаны ведаць, адкуль бярэ пачатак гісторыя народа, ведаць, з чаго пачынаецца Радзіма. Падпісваючы Дэкрэт аб захаванні помнікаў старажытнасці, Ленін меў на ўвазе іменна гэта.

Сэфан Паптонеў
ПОМСТА
АПАВЯДАННЕ

У гэтыя дні ў Беларусі знаходзіцца балгарскі пісьменнік, намеснік рэдактара газеты «Пулс» Стэфан Паптоневў, які збірае матэрыял для кнігі нарысаў пра Беларусь. На сваёй радзіме С. Паптоневў вядомы, як аўтар некальких зборнікаў вершаў і трох кніг прозы.

Прапануем вашай увазе апавяданне Стэфана Паптонева «Помста» з яго кнігі «Сваякі».

ЖАНЧЫН можна было прыняць за дзвюх сясцёр, адна з якіх была старэйшая за другую мабыць крыху болей, чым гэта бывае звычайна. Аднак адна з іх, дзябёлая, рыжавашчокая, спытала, выйшаўшы з трамвая:

— Прыехалі, дачушка?

Тут быў апошні прыпынак. Некаторыя з пасажыраў азірнуліся і здзіўлена паглядзелі на дачку, якая ні постацню, ні выглядам не была падобна на маці. Дачка адчула на сябе позіркі, пачырванела і, не азіраючыся, павяла маці. У руцэ яна сціскала паперку, на якой быў запісаны адрас. Яны ішлі не спяшаючыся, уважліва разглядваючы нумары дамоў. На гэтай ускраіне абедзьве былі ўпершыню. Тая, да якой звярнуліся са словам «дачушка», хаця і жыла ўжо многа год у горадзе, ніколі тут не была раней.

— Ці хутка? — спытала жанчына, якой цяжка было крочыць у сваіх старамодных чаравіках на шырокіх абцасах.

Дачка нервова паціснула плячыма. Якая яна маці ёй, гэта жанчына? Яна не памятала сваю сапраўдную маці. Яе выхоўвала бабулька, а потым, калі яна вучылася ў апошнім класе гімназіі, бацька вырашыў у другі раз ажаніцца. Ён саромеўся тады, вінавата апускаў пасівелую галаву перад дачкой, але гаварыў, што надыходзіць старасць, што няма каму глядзець за ім, што яна, яго дачка, як птушка, сёння тут, а заўтра — паляцела... Тады ў іх дом і прыйшла гэта жанчына. Пад адным дахам яна пражыла з ёй блізка года.

Нікаліна не хацела ўспамінаць пра той год. Усё ўжо сцерлася з памяці, і толькі нечаканае з'яўленне гэтай жанчыны зноў абудзіла ўспаміны... Калі Нікаліна атрымала тэлеграму: «Прыязджаю ў чацвер раніцай», яна падумала, што нехта пажартаваў. Потым, зняўшы тэлефонную трубку, каб праверыць, калі дакладна прыходзіць поезд, адчула, што пачынае па-сапраўднаму верыць таму, што напісана ў тэлеграме. Цікава, як выглядае тая, хто лічылася згодна закону яе маці, ці пастарэла яна, што́ прымусіла яе ажно з другога канца краіны прыехаць у сталіцу. Жаль ахапіў Нікаліну, калі яна ўбачыла, як гэта жанчына выходзіла з вагона, трымаючы ў адной руцэ чамадан, перавязаны вяроўкай, а ў другой—вялікі клунак, як яна бездапаможна азіралася навокал у натоўпе. Нечакана для самой сябе Нікаліна кінулася наперад, расштурхоўваючы людзей, каб хутчэй апынуцца каля мачыхі.

— З прыездам! — яна ўжо стаяла перад жанчынай.

Яна не магла сказаць ёй «мама». Слова гэта толькі падышло да вуснаў, але так і згасла. Госця апусціла свой багаж і стала абдымаць дзяўчыну. Яна гладзіла яе плечы, цалавала яе тонкімі запыленымі вуснамі. Яе зеленаватыя вочы з вялікімі зрэнкамі імгненна павільгатнелі. Яна вышарпала канцом хусцінкі слёзы, потым усміхнулася, потым зноў вышарпала вочы. Тое ж яна рабіла і ў трамваі, пакуль яны ехалі на ўскраіну. А ў памяці Нікаліны адна за адной паўставалі крыўды, перажытыя на віне гэтай жанчыны. Неадукаваная, з дэспатычным і эгаістычным характарам, яна ў той час мела нахабства выхваляцца перад суседзямі, што бацька Нікаліны больш трох-чатырох год не пражыве, і яна потым стане законнай гаспадыняй пяцідзесяці дэкараў зямлі і дома. Тады яна прывязе сваіх дзяцей ад першага мужа, яны будуць тут жыць, а зводныя падшыванцы няхай сабе ідуць на ўсе чатыры бакі. Яна і сапраўды здзейсніла сваю пагрозу. Бацька Нікаліны памёр праз тры гады. У Нікаліны і яе роднага брата былі ўжо сем'і — яны раз'ехаліся, не запатрабаваўшы сваю частку спадчыны. Адно толькі не сталася так, як прарочыла жанчына: не ўдалося прывезці сваіх дзяцей ад першага мужа, каб яны жылі з ёй у бацькоўскім доме... Абодва яе старэйшыя сыны ажаніліся і паехалі на новабудоўлі ў Сібір, а малодшы жыў недзе ў сталіцы са сваім бацькам. Нікаліна толькі чула пра гэта, а дзе яны жывуць, не ведала.

— Дай мне руку...

Нікаліна ўзяла яе руку. Заставалася яшчэ некалькі нумароў да таго адрасу, куды яны кіраваліся. Вось пяройдуць перакрыжаванне, і наступны дом, відаць, якраз і будзе той, што ім патрэбны. Для Нікаліны ўсё было цікава: і гэтая ўскраіна з нізкімі дамамі, што нагадвала сяло, і гэта жанчына, якую яна не любіла, і той яе разбэшчаны хлапец, якога яна прывезла тады, як выйшла за Нікалінінага бацьку. Як ён выглядае цяпер, столькі гадоў прамінула... Напэўна ён ужо мужчына і, магчыма, вусаты. Нікаліна ўсміхнулася: у Данча—вусы...

— Восемдзесят восем, — прачытала жанчына. — Тут гэта.

— Прыйшлі, — пацвердзіла Нікаліна.— Ты ўваходзь, а я пачакаю.

— Не, не! — ускліknула жанчына. — Хадзем са мной.

Яна дрыжэла, ніжняя яе губа нават пасінела. Што ж, калі ўжо згадзілася прыйсці сюды, можна зрабіць яшчэ некалькі крокаў, толькі б хутка ўсё скончылася. Нікаліне зусім не хацелася быць сведкай сустрэчы маці і сына, лепш бы пакінуць іх адных, а потым прыйсці да іх. Але калі яна так хоча...

Нікаліна націснула кнопку званка і штурхнула незачыненыя варотцы. Да ганку вялі плітні лімоннага колеру. З дому выйшаў невысокі юнак з непрычасанай чупрынай і з ледзьве прыкметнымі вусамі. Ён здзіўлена паглядзеў на абедзвюх жанчын, зрабіў некалькі крокаў па плітках ім насустрач і спытаў:

— Каго шукаеце?

Жанчына кінулася да юнака, абняла яго за плечы і прыціснула да грудзей:

— Данча, родны мой!- Які ты вырас!

Прагна, ненасытна яна цалавала юнака ў шчокі, гладзіла яго валасы, яго твар, ледзь стрымліваючы слёзы, задыхаючыся ад пакуты і шчасця. Нікаліна адчула, што нешта гарачае ўзнімаецца ў яе грудзях, што нават павекі пацяплелі. Юнак жа, разгублены ад такіх нечаканых абдымкаў, няўклюдна супраціўляўся, не разумеючы, што здарылася, магчыма нават не чуючы голасных усхліпванняў, якія безупынку паўтараліся:

— Я твая маці. Хіба ты не помніш мяне? Ох, які ты вырас!-

Разгублены юнак, нарэшце, вызваліўся з яе абдымкаў.

— Данча!

Тады хлопец сказаў вінавата:

— Прабачце, я не Данча. Я яго брат. Данча дома, я яго зараз паклічу.

Ён знік у доме, і неўзабаве адтуль паказаўся Данча. Нікаліна пазнала яго. Такія ж зялёныя вочы, такія ж тонкія матчыны вусны. Ён падышоў на чысценькіх плітачках, пацалаваў руку жанчыне і пачціва вымавіў:

— З прыездам!

Не назваў яе «мама». Па тым, як ён прывітаўся, Нікаліна адчула, што слова «мама» так і засталося на яго вуснах... Ці забыў Данча гэту жанчыну, якая нарадзіла яго? Альбо тая, пад чыім дахам ён жыў цяпер, прывязала яго да сябе мацней? Нікаліна ўбачыла, як рукі жанчыны апусціліся, на твары з'явіліся чырвоныя плямы, чырвань ахапіла яе шыю, разлілася па ілбе, на тварыступілі буйныя кроплі поту...

— З прыездам!—паўтарыў гэтак жа пачціва Данча.

Нікаліна сумелася. Чаму ён не скажа ёй хоць слова «мама»? Яна ж нарадзіла яго. Ён павінен зрабіць тое. што не могуць іншыя, напрыклад, яна, Нікаліна. У іх доме ён паспеў пражыць толькі некалькі месяцаў, пасля таго, як гэта жанчына прывезла яго ад свайго першага мужа. А як жыў Данча перад тым, раней? А як жыў пазней, калі яго бацька аднойчы ўначы прыехаў з міліцыянерам, каб забраць яго? На якіх дарогах хадзіў да таго, як трапіў у вось гэты нізенькі дом, на ўскраіне?..

Нікаліна перахапіла неспакойны позірк, які Данча кінуў на вуліцу... Ён дазволіў маці абняць сябе, пацалаваць. Сам некалькі разоў пацалаваў яе ў шчокі і ў лоб. Жанчына пачала распытваць, дзе ён працуе, калі звольніўся з вайсковай службы, як яго здароўе. Данча адказваў некалькімі словамі, а часцей — «так» альбо «не».

— А гэта твая сястра,— жанчына павярнулася да Нікаліны.

Данча працягнуў руку Нікаліне і сказаў:

— Добры дзень!

— Добры дзень!—адказала Нікаліна з нечаканай весялосцю ў голасе.

Яна зразумела, што ад непрымірымай варожасці паміж тым кплівым хлапчуком і вучаніцай апошняга класа гімназіі нічога не засталося.

Данча пайшоў іх праводзіць. Увесь час ён не вымавіў ні слова. Толькі на развітанне сказаў:

— Прабач, што не магу ісці далей...

І сунуў у руку жанчыне грошы.

— Не хвалюйся, мой хлопчык... Мне хопіць і таго, што я цябе пабачыла. А брату свайму скажы... рознае бывае... абазналася я...

Дзве жанчыны пакрочылі да трамвайнага прыпынку, а Данча заставаўся яшчэ некаторы час на перакрыжаванні.

Яны ішлі павольна, не спяшаючыся. Вагоны пад'язджалі і ад'язджалі з непрыемным скрыгатам. Нікаліна адчувала, што жанчына, што ішла маўкліва з ёю побач, раз-пораз ўзнімае да твару хустку... Нібыта яны вярталіся з пахавання. Што гэта было—помста лёсу? Альбо проста жыццё ішло сваім кірункам?

Нікаліна паглядзела на жанчыну і спалохалася: за гэтыя паўгадзіны яна пастарэла, вельмі пастарэла. Скура на твары пасунулася, пацямнела, яна ледзьве ступала па тратуары. І калі Нікаліна ўзяла яе пад руку, словы самі вырваліся з горла:

— Хадзем, мама...

Пераклаў з балгарскай мовы Ванкарэм НІКІФАРОВІЧ.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

27 чэрвеня

Першая праграма 10-00 — навіны (М). 10-15 — для дзяцей «Цуды прыроды» (М). 10-30 — для школьнікаў і малодшых школьнікаў «Вясёлы гарадок» (М). 11-00— для дзяцей. «Займальная азбука» (М). 16-55 — праграма перадач. 17-00 — канцэрт сімфанічнага аркестра Украінскага радыё і тэлебачання. Перадача з Кіева. 17-35— навіны (М). 17-45 — для школьнікаў «Людзі ленінскай гвардыі». «Таварыш Інэса». 18-10 — «Панарама навін». 18-25 — універсітэт педагагічных ведаў. «Што чытаюць вашы дзеці?» 18-45 — «Дзіўная гісторыя Мігеля дэ Сааведра». Тэлевізійны музычны фільм (М). 19-30 — на Кубак СССР па футболе (М). У перапынку — навіны (М). 21-15 — «Эстафета навін» (М). 22-00 — да 25-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Біяграфія маёй рэспублікі». Тэлевізійны дакументальны фільм. «Агонь». Фільм чацвёрты. 23-00 — «Турнір дапытлівых». 23-40 — «Скорасць плюс майстэрства». Тэленарыс аб міжнародных спаборніцтвах па аўтагонках. 24-00 — «Толькі факты». Праграма перадач.

28 чэрвеня

Першая праграма 8-25 — праграма перадач. 8-30 — экран — абітурыентам. «Маляванне і чарчэнне». 9-00 — «Гімнастыка для ўсіх» (М). 9-45 — навіны (М). 10-00 — «Будзьце шчаслівыя». Музычная вясёлая праграма (М). 10-30 — для малодшых школьнікаў. «Гісторыя, якой магло і не быць». 10-45 — дзіцячы экран. «Пра казла». Мультыплікацыйны фільм. 11-00 — «Тыдзень планеты». Міжнародны агляд. 11-20 — «Музычная шкатулка». 11-30 — спектакль Ленінградскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра камедыі. 14-30 — да 25-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Гэта песня пра нас, камбрыг». Сустрэча былых камандзіраў і праслаўленых партызанскіх брыгад. 15-30 — праграма каляровага тэлебачання. 1. «Горды карабліk». Мультфільм. «Кветка-сяміцветка». Тэлефільм. 2. «Лапа-расцяпа». Тэлевізійны спектакль па апавяданні Дж. Селінджэра (М). 17-00—да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. «Па ленінскіх месцінах». «Подых веку». Перадача 2-я. 17-30 — да 25-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Аперацыя Багратыён». Перадача 5-я. «На Мінскім напрамку». 18-00 — праграма каляровага тэлебачання. Свята савецкай моладзі. Трансляцыя з Цэнтральнага стадыёна імя У. І. Леніна (М). У перапынку — «Панарама навін». 21-15 — «Свет сацыялізма» (М). 21-45 — «Сельскі веснік». Выпуск, прысвечаны жывёлаводам Гродзеншчыны. 22-10 — да 25-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Біяграфія маёй рэспублікі». Тэлевізійны дакументальны фільм. «За подзвігам подзвіг». Фільм пяты. 23-00 —«Вячэрні Ленінград». Эстрадны канцэрт. Перадача з Ленінграда. 24-00 — «Толькі факты». Праграма перадач.

29 чэрвеня

Першая праграма 8-25 — праграма перадач. 8-30 — экран абітурыентам. «Матэматыка». 9-00 — «На зарадку станавіся!» (М). 9-15 —навіны (М). 9-30 — «Будзільнік» (М). 10-00 — «Музычны кіёск» (М). 10-30 — для школьнікаў. Канцэрт артыстаў Ленінградскага тэатра лялек. Перадача з Ленінграда. 11-00 — спартакіяда трактарных гігантаў (М). Уключэнне Мінска. 12-00 — для школьнікаў. «Школы мужнасці». 12-25 — «Старонкі вашых пісьмаў». Канцэрт па заяўках ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. 13-00 — «Сельская гадзіна» (М). 14-00 — для воінаў Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Перадача з Днепрапятроўска. 14-30 — праграма каляровага тэлебачання. І. Г. Прыедо. «Траянскі конь». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. 2. Канцэрт (М). 16-00— «Табе, юнацтва!» «У добры шлях!» Баль выпускнікоў сярэдніх школ (М). 17-00 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 17-30 — праграма каляровага тэлебачання. «Клуб кінападарожнікаў» (М). 18-30 — у эфіры — «Маладосць». Сёння Дзень савецкай моладзі (М). 19-15 — «Панарама навін». 19-30 — да 25-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Тэлевізійны рабочы клуб». У клубе сустракаюцца ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. 20-15 — «Еўропа: падзеі, краіны, праблемы» (М). 21-00 — да 25-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Біяграфія маёй рэспублікі». Тэлевізійны дакументальны фільм. «Дарога ў заўтра». Фільм шосты. 22-00 — фестываль эстрадной песні «Залаты Арфей». Перадача з Балгарыі. У перапынку — «Спартыўны тыдзень» (М).

Пагоня

ПАЛАЮЦЬ НА КАСТРАХ КАРЦІНЫ...

Гэта было днямі ў галандскім горадзе Гронінгене. Група відных мастакоў і скульптараў горада расклала на цэнтральнай плошчы вялікі касцёр, дзе замест дроў былі... аблітыя бензінам творы мастацтва.

Апошнім часам многія галандскія работнікі мастацтваў усё больш актыўна выказваюць свае незадаваленне той ролляю, якую яны вымушаны граць ва ўмовах капіталістычнай дзяржавы. Крыху раней у Паўночным аддзяленні галандскага Саюза работнікаў выяўленчых мастацтваў быў створаны спецыяльны «Камітэт дзеянняў», які паставіў сваёй задачай арганізацыю масавай агульнагаландскай дыскусіі на тэму «Мастак і грамадства» і змену цяперашняй дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры.

«Мы вымушаны ствараць культуру ў такім грамадстве, якое, наб існаваць і развівацца, мае патрэбу ў знішчэнні чалавечнасці і гаворыцца ў маніфесце «Камітэта дзеянняў». — Мы гатовы ліквідаваць нашы творы, наб такім шляхам звярнуць увагу ўсіх на працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве...». «Камітэт дзеянняў» заклікаў усіх нідэрландскіх работнікаў мастацтваў правесці «кампанію па знішчэнні сваіх твораў» у знак пратэсту супраць афіцыяльнай дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры.

Вогнішча на цэнтральнай плошчы Гронінгена было першым «водгукам» на гэты заклік. Першым, але не апошнім. Паводле дадзеных друку, публічнае спальванне мастацкіх твораў адбывалася і ў іншых гарадах. У Гаазе, напрыклад, вядомы мастак Пітэр ван Гаўдстраард днямі ў знак пратэсту публічна знішчыў у пярэму «Хойгенс» адну са сваіх найбольш вядомых карцін — «Нараджэнне». Такія ж акцыі рыхтуюць і некаторыя мастакі ў Амстэрдаме. Нядаўна група сталічных жывапісцаў дэманстрацыйна, пры вялікім збопышчы народу ўсклала жалобны вянок да будынка муніцыпальнага музея. «Мы хацелі б пахаваць тут сучасную палітыку ў галіне культуры», — заявілі мастакі журналістам.

Зразумела, далёка не ўсе галандскія дзеячы мастацтва адгукнуліся на заклік «Камітэта дзеянняў». Многія з іх, выступаючы супраць падначаленага становішча мастака ў буржуазным грамадстве супраць урадавай палітыкі ў галіне культуры, разам з тым з поўнай падставай указваюць на непрымальнасць такіх форм грамадскага пратэсту, як публічнае знішчэнне сваіх твораў.

Ю. КАРНІЛАЎ,
карэспандэнт ТАСС.

Куток КАЛЕКЦЫЯНЕРА

МІЖНАРОДНЫ КАНГРЭС ПРОТАЗОЛАГАЎ

У сувязі з Трэцім міжнародным кангрэсам протазолагаў, які адбудзецца сёлета ўвосень у Ленінградзе, выпушчана марка з малюнкам прасцейшага аднаклетачнага арганізма — радыялярыі. Аўтар малюнка — мастак Барыс Трыфанаў.

Колеры — цёмна-бэзавы, блакітны, жоўты. Друкаванне — глыбокае. Зубцоўка — рамачная. Памеры па перфарацыі 28 на 40 міліметраў. Намінал — 6 капеек. Нумар па каталогу — 3800.

Людміла КЕЛІМ,
(АДН).

Дырэкцыя, партыйная арганізацыя і мясцовы камітэт Мінскага музычнага вучылішча імя М. І. Глінкі смутнуюць з прычыны заўчаснай смерці былога выкладчыка вучылішча Уладзіміра Міхайлавіча Данскога і выказваюць спачуванне сям'і нябожчыка.

Беларускае тэатральнае аб'яднанне глыбока смутнуе аб смерці дырэктара Дзяржаўнага ансамбля танца БССР Данскога Уладзіміра Міхайлавіча і выказвае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, Р. С. БЯРОЗКІН, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры—3-21-53, аддзела тэатра кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры, вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі—3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».
Індэкс 63856 АТ 03885 13